WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
12 ЛІПЕНЯ 2011 г.
АЎТОРАК
№ 129 (26993)
Кошт 750 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «СЛАВЯНСКІ БАЗАР У ВІЦЕБСКУ» ШЫРОКА АДКРЫВАЕ ДЗВЕРЫ ДЛЯ ДЫЯЛОГА КУЛЬТУР»

**СЛАВЯНСКІ базар у Віцебску шмат у чым вызначае шляхі развіцця сучаснай культуры. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 8 ліпеня на адкрыцці XX Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

«20 гадоў таму ў небе над нашай Беларуссю з'явілася новая яркая зорка, імя якой «Славянскі базар». Узнікнуўшы як сумеснае пачынанне Беларусі, Расіі і Украіны, цудоўнае свята творчасці хутка перасягнула межы, стаўшы падзеяй сусветнага маштабу. Тут пабывалі прадстаўнікі ўсіх пакаленняў і ўсіх кантынентаў Зямлі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Напэўна, многія ўжо крыху забылі, які цяжкі шлях давялося прайсці фестывалю. Быў жа час, калі наогул стаяла пытанне: «Быць ці не быць «Славянскаму базару»? Гаварылі, што для камерцыйнага «поспеху» яго трэба перанесці на бераг цёплага мора», — нагадаў Аляксандр Лукашэнка.

«Тады мы цвёрда сказалі: не, фестывалю быць. І быць на беларускай зямлі. Родным домам гэтага фестывалю павінен быць беларускі Віцебск — калыска славянства, — адзначыў Прэзідэнт. — Сёння мы з поўным правам можам заявіць, што маштабны форум у Віцебску шмат у чым вызначае шляхі развіцця сучаснай культуры. Тут не толькі выступаюць буйнейшыя зоркі сусветнага мастацтва. Яшчэ больш прыемна, што сотні маладых артыстаў упэўнена пайшлі са сцэны гэтага амфітэатра насустрач сапраўднай славе і прызнанню».

СТАР. 2

## СПЕЦЫЯЛЬНАЯ ЎЗНАГАРОДА «ПРАЗ МАСТАЦТВА — ДА МІРУ І ЎЗАЕМАРАЗУМЕННЯ» ЎРУЧАНА ІГАРУ ЛУЧАНКУ

**Спецыяльная ўзнагарода Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення» ўручана 8 ліпеня народнаму артысту СССР, народнаму артысту Беларусі кампазітару Ігару Лучанку на ўрачыстай цырымоніі адкрыцця XX Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», перадае БЕЛТА.**


Фота БЕЛТА.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Ігару Лучанку за талент і самаадданае служэнне мастацтву.

Ігар Лучанок — удзельнік усіх фестываляў. Выказваючы ўдзячнасць за высокую ацэнку свайго ўкладу ў мастацтва, кампазітар адзначыў: «Славянскі базар» — унікальная з'ява ў фестывальным свеце, яму няма аналагаў».

Спецыяльная ўзнагарода «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення» ўручаецца дзеячам культуры і мастацтва, творчым калектывам, арганізацыям, якія ўнеслі значны ўклад ва ўмацаванне міжнароднага культурнага супрацоўніцтва, прапаганду дасягненняў і ўзораў сусветнай мастацкай культуры, заснаваных на гуманістычных ідэалах і каштоўнасцях. Да ўзнагароды прыкладаецца дыплом, які падпісваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

З 2009 года імёны лаўрэатаў спецыяльнай узнагароды ўвекавечваюць на Алеі зорак. Сёння тут загарэлася сёмая зорка — Ігара Лучанка. Першым уладальнікам узнагароды ў 2005 годзе стаў расійскі кампазітар Андрэй Пятроў.


Фота БЕЛТА.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ДВАЦЦАЦЬ ГАДОЎ — ГЭТА ТОЛЬКІ ПАЧАТАК

### «Славянскі базар» зачараваны на дажджы

**Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» зачараваны на дажджы. Такую думку выказала карэспандэнту БЕЛТА вядучы інжынер-сіноптык Віцебскага абласнога цэнтра па гідраметэаралогіі і маніторынгу навакольнага асяроддзя Людміла БАРАДЗЯНОК.**

Калі спытаць любога віцябчаніна або пастаяннага госця форуму, якую асацыяцыю выклікае ў іх фестываль, то першым адказам абавязкова будзе дождж. Не стаў выключэннем і цяперашні форум: непрацяглыя трапічныя ліўні ідуць у Віцебску фактычна штодзень. Цікава, што галоўнай зонай іх выпадзення з'яўляецца цэнтральная частка горада, дзе размешчаны асноўныя пляцоўкі «Славянскага базару».

Ападкі, што выпалі гэтымі днямі ў цэнтры Віцебска, перавысілі дэкадную норму. Гарачае і дажджлівае надвор'е будзе суправаджаць форум і ў астатнія дні. Тэмпература паветра ў пачатку тыдня павысіцца да плюс 28 градусаў, з 13 ліпеня яна чакаецца крыху ніжэйшая — 22-26 вышэй за нуль. Тым, хто не хоча асвяжыцца пад летнім дажджом, сіноптыкі рэкамендуюць не забываць гэтымі днямі парасон.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### БРУНЕТКА — ПЕРШАЯ, БЛАНДЗІНКА — ДРУГАЯ...

**СЁЛЕТА на «базары» на конкурсе маладых выканаўцаў у нас, як ніколі раней, шмат шанцаў перамагчы. Шчыра хочацца ў гэта верыць. Беларуска Алена Ланская — прыгажуня, бландзінка, якая спявае. Канкурэнтам Алены будзе цяжка змагацца за Гран-пры, які сёлета «пацяжэў» да 15 тысяч долараў. Алена, калі праходзіў канцэрт-жараб'ёўка, так добра выканала ўсім вядомую песню «Малады ды нежанаты...», што многія ў зале філармоніі амаль што танцавалі. Наша зямлячка на конкурсе выступае другой пасля прадстаўніцы Расіі.**

Цікава, што расіянка Мары Карне — мулатка. Акцэнт на гэтым не раблю, проста даволі нечакана было ўбачыць на сцэне дзяўчыну з Расіі з такой знешнасцю. Але чаму б і не? На «базары» «галоўная нацыянальнасць» — талент. Мары выдатна спела «Рускі вальс».

Што тычыцца прадстаўніка Украіны, то Уладзімір Квасніца — тыповы мача: высокі брунет, такія вельмі падабаюцца жанчынам. Ды і спяваць можа добра. Выступае пад 19-м нумарам.

Цікава, што сярод удзельнікаў ёсць прадстаўнік Чэхіі па прозвішчы Дэйл, які, проста як Білан, сыграў на раялі падчас сваёй «прэзентацыі». Шчаслівая лічба 13 дасталася прадстаўніку Балгарыі. Апошняй — дваццатай — выступіць Маргарыта з Эстоніі.

На «базары» журы XX Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні ўзначальвае міністр культуры Беларусі Павел Латушка. Раней беларускія чыноўнікі «не судзілі». Ён прызнаўся, што прызначэнне яго на гэтую пасаду стала для яго поўнай нечаканасцю, узначальваць журы вельмі адказна. Учора ў Летнім амфітэатры адбылося першае выступленне маладых канкурсантаў, а сёння яны спяюць вечарам у другі раз. Зразумела, мы «хварэем» за нашу прыгажуню.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## БЕЛАРУСЫ ЗАМЕЖЖА ЎПЕРШЫНЮ НА «БАЗАРЫ» ПРАДСТАВІЛІ КУЛЬТУРНУЮ ПРАГРАМУ

**У ёй бралі ўдзел беларусы з больш як дзесяці краін свету: Латвіі, Літвы, Эстоніі, Малдовы, Украіны, Польшчы, Расіі...**

**Гэтай падзеі чакалі даўно. Насамрэч, беларусаў ва ўсім свеце за межамі нашай рэспублікі — мільёны.**

**У канцэртнай зале «Віцебск» прайшоў шыкоўны канцэрт. А да гэтага ў віцебскім аблвыканкаме адбылося пасяджэнне кансультацыйнай рады па справах беларусаў замежжа пры Міністэрстве культуры.**

**Этнічныя беларусы з розных краін на «базары» адчувалі сябе вельмі ўтульна. Некаторыя, праўда, здзіўляліся: чаму ў беларускім Віцебску рэдка чуюць беларускую мову?**

### Мы будзем разам у шчасці і ў бядзе

— Мы часта бываем у Беларусі. Кантакты даволі багатыя, актыўна «абменьваемся» калектывамі мастацкай самадзейнасці. Запрашаем працаваць з нашымі калектывамі беларускіх спецыялістаў. Я прадстаўляю беларусаў Беластока. Калі прыязджаю ў Беларусь, у мяне сэрца радуецца ад таго, што беларусы жывуць на ўзроўні. І народ вельмі гасцінны — шмат бываю за мяжой, ёсць з чым параўноўваць, — адзначыў у размове з карэспандэнтам «Звязды» **Ян СЫЧЭЎСКІ, старшыня галоўнага праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы.** — Я — беларус, і для мяне Беларусь з'яўляецца этнічнай Радзімай. Заўсёды была і такой будзе — і ў шчасці, і ў бядзе. Праўда, трохі здзіўляе, што, на жаль, мала даводзіцца чуць у Беларусі беларускую мову. У Польшчы мы праводзім розныя мерапрыемствы, у тым ліку святы беларускай песні, культуры, Купалле беларускае з задавальненнем арганізоўваем.

Як расказаў «Звяздзе» **Валерый КАЗАКОЎ, старшыня Федэрацыі нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусы Расіі»**, у Расіі ўжо больш за дзесяць нацыянальных культурных цэнтраў Беларусі, якія існуюць пры фінансавай дапамозе расійскага бюджэту. Падтрымліваюцца пастаянныя сувязі з Беларуссю. Як ён падкрэсліў, уплыў беларусаў — нашых майстроў, рамеснікаў, навукоўцаў — на станаўленне расійскай дзяржавы вялікі. У прыватнасці, шмат беларусаў будавалі і старажытную Маскву. Зараз вядзецца навуковае даследаванне па гэтай тэме. І гэтай ініцыятывай вельмі зацікавілася Нацыянальная акадэмія навук. Цікава, што і цяпер, як адзначыў суразмоўца, ёсць у Расіі цэлыя беларускамоўныя вёскі, дзе жыхары з пакалення ў пакаленне перадаюць нацыянальныя традыцыі.

— Заўсёды, калі пераязджаю празрыстую расійска-беларускую мяжу, пачынае па-іншаму біцца сэрца, — шчыра прызнаўся ў любові да нашай краіны спадар Казакоў. — Мы зараз праводзім вельмі цікавую акцыю — «Вяртанне»: спрыяем вяртанню каштоўнасцяў культуры, якія ў розныя гады былі вывезены ў розныя краіны.

СТАР. 5

## ПАД КРЫЖЫКАМ

*У Шклове зроблены ўнікальныя археалагічныя знаходкі*

**На гарадзішчы старога Шклова працуе археалагічная экспедыцыя Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Аркадзя Куляшова. У першы ж дзень на зусім невялікай глыбіні ў глебе ўдалося адшукаць крыж-энкалпіён.**



Энкалпіён — гэта невялікі крыж з выявамі Хрыста альбо святых. Унутры энкалпіёна звычайна змяшчаліся часткі мошчаў святых, каб абараніць чалавека ад розных бед, асабліва ў далёкіх вандроўках і паходах.

**Прафесар, доктар гістарычных навук Ігар МАРЗАЛЮК**, які кіруе раскопкамі, назваў новую шклоўскую знаходку фантастычнай па сваёй захаванасці. Крыж праляжаў у шклоўскай зямлі сотні гадоў, але і сёння добра відаць яе выявы, захаваліся рэшты арганікі — напэўна, мошчаў.

Студэнты-археолагі зрабілі і іншыя важныя знаходкі: сярэбраны медальён XVI стагоддзя і пячатка з гербам канцлера Вялікага Княства Літоўскага Альбрэхта Гаштольда. Гісторыкі мяркуюць, што яны цяпер працуюць на месцы, дзе раней стаяў магутны сярэднявечны замак. Раскопкі працягваюцца.

**Ілона ІВАНОВА.**

## Грошы

### З 13 ЛІПЕНЯ СТАЎКА РЭФІНАНСАВАННЯ ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА ДА 20 ПРАЦЭНТАЎ ГАДАВЫХ

Такое рашэнне прыняло кіраўніцтва Нацыянальнага банка пастановай ад 11.07.2011 №287, паведамляе прэс-служба Нацбанка.

Гэта зроблена ў рамках правядзення паслядоўнай працэнтнай палітыкі, накіраванай на паступовае павышэнне агульнага ўзроўню працэнтных ставак у эканоміцы з мэтай садзейнічання абмежаванню інфляцыі і стымуляванню ашчадных працэсаў у краіне.

Планамернае павышэнне працэнтных ставак будзе садзейнічаць павелічэнню прыцягальнасці рублёвых укладаў насельніцтва і арганізацый у банках, умацаванню курса нацыянальнай валюты, а значыць, росту даверу да яе з боку ўсіх эканамічных агентаў. Пры гэтым паступовасць павышэння стаўкі дазваляе ўлічваць інтарэсы пазычальнікаў, якія ўжо маюць крэдытную запазычанасць перад банкамі.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### СЛЕДСТВА ВЫСВЕТЛІЛА, ШТО ПАСКОРЫЛА ТРАГЕДЫЮ НА «БУЛГАРЫІ»



**Круізны цеплаход «Булгарыя», у катастрофе якога звыш 100 чалавек загінулі і 79 выратаваны, мог затануць на Волзе ў нядзелю з-за тэхнічнай няспраўнасці, лічаць у Следчым камітэце Расіі. Яго супрацоўнікі, якія працуюць на месцы катастрофы, устанавілі, што яшчэ пры выхадзе з порта Казані ў судна назіраўся нахіл на правы бок.**

Правы нахіл можа быць следствам не вызваленых своечасова каналізацыйных ёмістасцяў, наяўнасці паліва толькі ў правым баку і іншых акалічнасцяў, растлумачылі ў Прыволжскім следчым упраўленні на транспарце.

Таксама адразу было ўстаноўлена, што цеплаход меў няспраўнасць галоўнага левага рухавіка і, тым не менш, выйшаў у рэйс.

### РАДЗІНСКІ ТРАПІЎ У ДТЗ, У ВЫНІКУ ЯКОГА ЗАГІНУЛА ДЗЯЎЧЫНА

**Джып Volvo XC-90 пад кіраваннем расійскага пісьменніка, гісторыка і драматурга Эдварда Радзінскага перад сутыкненнем з аўтамабілем Nissan X-Trail, у выніку якога загінула пасажырка машыны 24-гадовая Марыя Кулікова, выехаў на паласу сустрэчнага руху.**

Як паведамілі ў прэс-службе Галоўнага ўпраўлення МУС РФ па Маскоўскай вобласці, «74-гадовы жыхар Масквы на асабістым аўтамабілі Volvo, выехаўшы на паласу сустрэчнага руху, здзейсніў сутыкненне з аўтамабілем Nissan X-Trail. Ад атрыманых пашкоджанняў памерла на месцы ДТЗ пасажыр аўтамабіля Nissan, жыхарка Адзінцоўскага раёна».



Ва ўпраўленні інфармацыі абласнога глаўка МУС паведамілі, што менавіта Радзінскі, паводле папярэдніх звестак, справакаваў дарожную аварыю. Аднак там падкрэслілі, што «пакуль пэўны вінаваты гэтай аварыі не ўстаноўлены».

Сам Радзінскі заявіў, што аварыя адбылася на павароце, дзе яго пазадарожнік занесла на слізкай ад дажджу дарозе і аўтамашына выскачыла на паласу сустрэчнага руху.

### ЗАХОДНІЯ БЛОГЕРЫ: СОРАС РАБУЕ РАСІЮ, СЕРБІЮ, ВЯЛІКАБРЫТАНІЮ І ІТАЛІЮ

**Мультымільярдэр Джордж Сорас праводзіць рабаўніцкія аперацыі супраць Расіі, Сербіі, Англіі і Італіі, піша блогер Milla Dukic у супольнасці выдання The Wall Street Journal.**



Мільярдэр названы «адным з буйнейшых сучасных аферыстаў». Сцвярджаецца, што «на працягу ўсяго жыцця і дагэтуль ён займаецца рабаўніцкімі аперацыямі ў Расіі, Сербіі, Англіі і Італіі». У верасні 1992 года, падчас адкрытай канфрантацыі з Банкам Англіі Сорас разбурыў брытанскі фунт і італьянскую ліру і зарабіў на гэтым 12 млрд долараў.

## Трагедыі

### САМАЛЁТ УПАЎ НА ГАРАЖ

У лесе каля в. Мінеўшчына (Ваўкавыскі раён) прапала жанчына. На яе пошукі прыляцеў звышлёгкі самалёт «Бекас Х-32» авіяцыйнага атрада «Пружаны Авіяхімсэрвіс»

Як паведаміла прэс-служба МНС, самалёт а 17.00 вылецеў назад, на пункт базавання ў Пружаны, аднак пілот адхіліўся ад маршрута і накіраваўся ў г. п. Рось. Як сцвярджаюць сведкі, самалёт ляцеў вельмі нізка, і калі рабіў разварот, то заваліўся на крыло, згубіў канчаткова вышыню і ўпаў на гараж па вул. Чырвонаармейскай у г. п. Рось. У выніку катастрофы пілот самалёта загінуў, былі пашкоджаны перакрыцце гаража і аўтамашына, якая ў ім знаходзілася.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

### НА ПАТАНУЛЫМ НА ВОЛЗЕ ЦЕПЛАХОДЗЕ ЗНАХОДЗІЛІСЯ ДВА БЕЛАРУСЫ

**Паводле папярэдняй інфармацыі, атрыманай з пасольства Беларусі ў Расіі, на патанулым у Куйбышаўскім вадаёме цеплаходзе на Волзе знаходзіліся двое грамадзян Беларусі. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе МЗС Беларусі.**

У знешнепалітычным ведамстве адзначылі, што адзін беларускі грамадзянін выратаваны, цяпер вядуцца пошукі другога.

Супрацоўнікі аддзялення беларускага пасольства ў Расіі ў Казані знаходзяцца ў пастаянным кантакце з расійскім МНС.

белагропромбанк
традиции будущего

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2011 г.
ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2011 г. | 2010 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 428 910,1 | 273 303,2 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 2 505,3 | 2 550,0 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 4 191 084,4 | 973 838,1 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 224 870,3 | 378 492,7 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 1 419 526,8 | 753 717,9 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 30 237 583,7 | 19 189 037,3 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | 8 750,0 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 390 268,9 | 153 045,1 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 603 207,7 | 496 558,6 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | 1 946,3 | 2 051,2 |
| 12 | Прочие активы | 1111 | | 146 385,4 | 148 537,9 |
| **13** | **ИТОГО активы** | **11** | | **37 646 288,9** | **22 379 882,0** |
| 14 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 15 | Средства Национального банка | 1201 | | 7 534 287,1 | 3 475 493,4 |
| 16 | Средства банков | 1202 | | 6 427 264,6 | 3 701 915,3 |
| 17 | Средства клиентов | 1203 | | 13 639 621,6 | 8 975 321,1 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 3 689 395,6 | 1 437 599,7 |
| 19 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 770,9 | 23,8 |
| 20 | Прочие обязательства | 1206 | | 224 420,0 | 110 024,2 |
| **21** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **31 515 759,8** | **17 700 377,5** |
| 22 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 23 | Уставный фонд | 1211 | | 5 003 635,0 | 3 878 635,0 |
| 24 | Эмиссионный фонд | 1212 | | - | - |
| 25 | Резервный фонд | 1213 | | 250 189,9 | 193 989,9 |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 311 417,2 | 241 253,8 |
| 27 | Накопленная прибыль | 1215 | | 565 287,0 | 365 625,8 |
| **28** | **ВСЕГО капитал** | **121** | | **6 130 529,1** | **4 679 504,5** |
| **29** | **ИТОГО обязательства и капитал** | **12** | | **37 646 288,9** | **22 379 882,0** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2011 г.
ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2011 г. | 2010 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 1 770 108,0 | 1 351 089,3 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 1 077 754,3 | 765 646,9 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 692 353,7 | 585 442,4 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 196 694,3 | 124 591,3 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 41 302,9 | 16 819,8 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 155 391,4 | 107 771,5 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 635,1 | 163,0 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 48,8 | (7 068,5) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 225 121,5 | 60 751,6 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | (148 353,3) | (24 336,2) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 461 715,7 | 398 659,2 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 59 393,7 | 103 341,8 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 268 251,1 | 207 769,0 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 32 003,4 | 22 567,0 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 222 620,7 | 197 070,4 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | | 63 170,0 | 58 764,0 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 159 450,7 | 138 306,4 |

**Председатель Правления** **В.И. Подковыров**
**Главный бухгалтер** **М.А. Шаповалова**
**Дата подписания «7» июля 2011 г.**

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
время работы Контакт-Центра Банка
8.00–20.00 – рабочие дни
8.00–18.00 – выходные и праздничные дни
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

*Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.*

ISSN 1990 - 763X

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.07.2011 г. (для б/н разлікаў) | | Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ |
|---|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША ... 4 989,00 | 1 чэшская крона ... 292,01 | USD ... 28,0839 |
| ▼ 1 еўра ... 7 061,43 | 1 польскі злоты ... 1 778,39 | 10 UAH ... 35,1752 |
| 1 латвійскі лат ... 9 950,14 | ▼ 1 расійскі рубель ... 177,65 | 10000 BYR ... 56,5182 |
| 1 літоўскі літ ... 2 043,83 | 1 украінская грыўня ... 624,60 | EUR ... 39,8033 |

## ТЭМП РОСТУ ВУП У БЕЛАРУСІ ЗА І ПАЎГОДДЗЕ СКЛАЎ 111 ПРАЦЭНТАЎ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 11 ліпеня прыняў намесніка прэм'ер-міністра Сяргея Румаса, які праінфармаваў аб асноўных выніках эканамічнага развіцця за першае паўгоддзе, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

У прыватнасці, за гэты перыяд рост ВУП склаў 111 працэнтаў, узраслі прадукцыйнасць працы, рэнтабельнасць продажаў.

Па выніках пяці месяцаў тэмп росту экспарту перасягнуў тэмп росту імпарту. Сальда гандлю таварамі і паслугамі за май склалася дадатнае ў памеры $116 млн.

Прэзідэнт даручыў ураду ўважліва прааналізаваць гэтыя паказчыкі і працаваць над тым, каб дабіцца ўстойлівага росту эканомікі.

## «СЛАВЯНСКІ БАЗАР У ВІЦЕБСКУ» ШЫРОКА АДЧЫНЯЕ ДЗВЕРЫ ДЛЯ ДЫЯЛОГА КУЛЬТУР»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У фестывальныя дні Беларусь шчодра раскрывае душу яго ўдзельнікам і гасцям, ахвотна дзеліцца сваёй гісторыяй, багатай культурай і самае галоўнае — дабрынёй і гасціннасцю. «Мы рады вітаць не толькі гледачоў у гэтай зале, але і мільённую аўдыторыю каля тэлеэкранаў. Людзі ў розных кутках планеты атрымалі магчымасць бліжэй пазнаць і палюбіць беларускую зямлю, стаць нашымі шчырымі сябрамі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Я нярэдка задаюся пытаннем: «Чаму ўсё ж такі наш «Славянскі базар» такі папулярны, чаму яго так цэняць і любяць ва ўсім свеце?» Думаю, перш за ўсё таму, што ён не ставіць перад выканаўцамі ніякіх штучных перашкод, дае кожнаму поўную свабоду творчасці. Дае магчымасць бліснуць самымі яркімі гранямі свайго таленту. Тут пануе павага да нацыянальнай своеасаблівасці любога народа. Ён добры, спагадлівы, наш фестываль, і заўсёды становіцца ўтульным домам для артыстаў і гледачоў. Менавіта за гэта яго і любяць», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго слоў, у «Славянскага базару» вельмі добрая рэпутацыя. «Якія б страсці ні разгараліся за кулісамі, якія б ні сутыкаліся густы, ацэнкі заўсёды былі сумленныя і аб'ектыўныя. Фестываль ніколі не станавіўся арэнай скандалаў і закуліснай барацьбы. Так будзе заўсёды. Тут усё шчыра і адкрыта. Такі заслужаны імідж нашага фестывалю», — перакананы беларускі лідар.

«Ён абсалютна незалежны ад палітычнай кан'юнктуры. З першага дня свайго існавання ён застаецца верным галоўнай мэце — шырока адкрываць дзверы для зацікаўленага дыялога культур і цывілізацый. У Віцебску сустракаюцца не толькі артысты, але і палітыкі, дыпламаты, грамадскія дзеячы — мова мастацтва пры гэтым не патрабуе ніякага перакладу», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Славянскі базар у Віцебску паспяхова выконвае місію захавання адзінай культурнай прасторы славянскіх народаў, заявіў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «Наш форум паспяхова выконвае місію захавання адзінай культурнай прасторы славянскіх народаў. Зусім не выпадкова ён узнік на беларускай зямлі, якая з'яўляецца адным з самых старажытных духоўных цэнтраў славянства».

Аляксандр Лукашэнка не сумняваецца, што, «сталеючы» і ўдасканальваючыся, наш любімы фестываль захавае традыцыі і непаўторнае абаянне, прадоўжыць набіраць вышыню. За кошт новых напрамкаў мастацтва і сучасных мастацкіх плыняў ён абавязкова пашырыць свае гарызонты і яшчэ больш узбуйніць маштаб.

«Вядома ж, нязменнымі застануцца наша вялікая любоў да гэтага творчага форуму і яго дзяржаўная падтрымка. Бо ён па праву з'яўляецца візітнай карткай суверэннай і незалежнай Беларусі», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў усім, хто на працягу двух дзесяцігоддзяў працуе ў імя фестывалю і кожны год дорыць нам непаўторны свет прыгожага.

Прэзідэнт падкрэсліў: «Самае лепшае свята — тое, што назаўсёды застаецца з табой. Няхай жа юбілейны «Славянскі базар» будзе менавіта такім, каб кожны захацеў зноў і зноў вяртацца ў Віцебск. Жадаю ўдзельнікам паспяховых выступленняў, бурных апладысментаў і поўных залаў, а ўсім нам — яркіх уражанняў і выдатнага настрою».

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ВЫКАЗАЎ СПАЧУВАННІ ДЗМІТРЫЮ МЯДЗВЕДЗЕВУ Ў СУВЯЗІ З АХВЯРАМІ Ў ВЫНІКУ КАТАСТРОФЫ ЦЕПЛАХОДА «БУЛГАРЫЯ»

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў глыбокія спачуванні Прэзідэнту Расійскай Федэрацыі Дзмітрыю Мядзведзеву ў сувязі з чалавечымі ахвярамі ў выніку катастрофы цеплахода «Булгарыя». Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

## Спорт-тайм

### МІНСКАЕ «ДЫНАМА» НАБІРАЕ АБАРОТЫ

**Чарговую перамогу ў чэмпіянаце Беларусі па футболе сярод каманд вышэйшай лігі атрымала мінскае «Дынама»: сталічная каманда дома абыграла магілёўскі «Днепр» з лікам 2:0 і выйшла на 4-е месца ў турнірнай табліцы.**

А вось другое «Дынама», брэсцкае, зноў саступіла суперніку і можа пазбавіцца галоўнага трэнера. На гэты раз брастаўчане прайгралі на сваім полі наваполацкаму «Нафтану» — 1:3. Пасля матча галоўны трэнер гаспадароў Юрый Пунтус заявіў аб сваёй адстаўцы. Барысаўскі БАТЭ на выездзе абыграў «Тарпеда-БЕЛАЗ» з Жодзіна — 3:0 і павялічыў на адно ачко адрыў ад салігорскага «Шахцёра», які на сваім полі не здолеў перамагчы «Гомель» — 1:1. Футбольны клуб «Мінск» пасля поспеху ў Лізе Еўропы у родным чэмпіянаце працягвае засмучаць сваіх балельшчыкаў. На гэты раз мінчане ў гасцях мінімальна саступілі «Віцебску» — 0:1. Бабруйская «Белшына» дома «распісала нічыю» з гродзенскім «Нёманам» — 1:1.

Становішча каманд пасля 17 тураў: БАТЭ — 41 ачко, «Шахцёр» — 33, «Нафтан» — 27, «Дынама» (Мінск) — 24, «Гомель» — 24, «Нёман» — 22, «Белшына» — 21, «Тарпеда-БЕЛАЗ» — 21, «Віцебск» — 20, «Мінск» — 18, «Днепр» — 13, «Дынама» (Брэст) — 12. БАТЭ і «Шахцёр» правялі па 18 матчаў, астатнія каманды — па 17.

### КУБАК ДЭВІСА: СТАІМ НА МЕСЦЫ

**Тэнісісты зборнай Беларусі прайгралі ў гасцях камандзе Венгрыі з лікам 2:3 у матчы Кубка Дэвіса (другая група Еўра-Афрыканскай зоны).**

Спачатку Уладзімір Ігнацік абыграў Адама Келнера — 7:6, 6:4, 5:7, 1:6, 7:5, Аціла Балаш жа ў адказ — Сяргея Бетава — 6:2, 6:1, 7:5. У другі дзень у парнай гульні Уладзімір Ігнацік і Максім Мірны выйгралі ў Карнела Барджоскі і Марціна Фуксавіча — 7:5, 6:7, 6:7, 6:1, 6:4. У трэці гульнявы дзень Уладзімір Ігнацік прайграў Балашу — 6:7, 3:6, 6:7, а Сяргей Бетаў таксама саступіў Адаму Келнеру — 2:6, 0:6, 2:6. Такім чынам, беларусы застаюцца ў другой групе Еўра-Афрыканскай зоны, дзе і працягнуць выступленні ў наступным годзе, а венгры пазмагаюцца з камандай Вялікабрытаніі за права згуляць у першай групе ЕАЗ.



### МЕКСІКАНСКІЯ ЮНАКІ — ЧЭМПІЁНЫ СВЕТУ

**Зборная Мексікі ў родных сценах стала чэмпіёнам свету сярод гульцоў, чый узрост не перавышае 17 гадоў.**

Юнацкая зборная Мексікі выйграла чэмпіянат свету па футболе. У фінале мясцовыя футбалісты перамаглі каманду Уругвая з лікам 2:0. Такім чынам, зборная Мексікі ў другі раз у сваёй гісторыі стала чэмпіёнам свету сярод гульцоў ва ўзросце да 17 гадоў. Варта адзначыць, што каманда гаспадароў выйграла ўсе матчы на сусветным першынстве.

### У БЭКХЭМАЎ НАРАДЗІЛАСЯ ДАЧКА



**У сям'і вядомага англійскага футбаліста-метрасэксуала Дэвіда Бэкхэма нарадзілася чацвёртае дзіця — і першая дзяўчынка.**

Немаўля вагой 3 кілаграмы 459 грамаў з'явілася на свет у шпіталі «Сідар-Сінай» у Лос-Анджэлесе. Вікторыі было зроблена кесарава сячэнне. Бацькі назвалі дзяўчынку Харпер Сэвен. У пары Бэкхэмаў ужо ёсць тры сыны: 11, 8 і 5 гадоў.

## У БАЛГАРЫІ ЗДАРЫЛАСЯ МАСАВАЕ АТРУЧЭННЕ БЕЛАРУСКІХ ДЗЯЦЕЙ

Паводле інфармацыі беларускага консула ў Балгарыі, паступіла інфармацыя аб масавым атручэнні беларускіх дзяцей, якія адпачываюць у атэлі «Грын-парк» у горадзе Кітэн. У знешнепалітычным ведамстве падкрэслілі: «На гэты час вядома, што колькасць беларускіх дзяцей, якія адпачываюць у гэтым атэлі, — каля 130 чалавек. Асноўны пік захваральнасці прыпаў на нядзелю, 10 ліпеня. Былі выкліканы балгарскія ўрачы і своечасова аказана неабходная дапамога, дзякуючы чаму ўдалося пазбегнуць шпіталізацыі беларускіх дзяцей». Цяпер стан дзяцей здавальняючы.

**БЕЛТА.**

## МАЙКІ НА ГАЛАВУ

нацягнулі двое грамадзян і раніцай з нядобрымі намерамі завіталі ў хату да 80-гадовай жыхаркі вёскі Шычы Калінкавіцкага раёна. Мужчыны, пагражаючы пенсіянерцы нажом, забралі 350 тысяч рублёў і зніклі на веласіпедах. Нягледзячы на «маскіроўку», зладзеяў міліцыя затрымала хутка. Імі аказаліся двое маладых рабочых мясцовага сельскагаспадарчага прадпрыемства.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# У БЕЛАРУСІ ПАШЫРАНЫ ЛЬГОТЫ ДЛЯ ІНВЕСТАРАЎ

**МІНІСТЭРСТВА эканомікі лічыць, што падпісаны 6 чэрвеня 2011 года Дэкрэт Прэзідэнта №4 станоўча адаб'ецца на прытоку інвестыцый у краіну, пра гэта заявіў на брыфінгу Кірыл КАРАЦЕЕЎ, начальнік галоўнага ўпраўлення інвестыцый Мінэканомікі. Вышэйназваны нарматыўны акт унёс дапаўненні і змены ў Дэкрэт №10 ад 6 жніўня 2009 «Аб стварэнні дадатковых умоў для інвестыцыйнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь», накіраваныя на ўстанаўленне яшчэ больш ільготных умоў для прыцягнення інвестыцый.**

— Прыняты Дэкрэт №4 уносіць змены ў сённяшні парадак і ўмовы заключэння інвестыцыйных дамоў. Вопыт, які Беларусь атрымала пры заключэнні гэтых дамоў, быў пазітыўным, таму мы вырашылі яго трошкі распаўсюдзіць, — сказаў Кірыл Карацееў.

Па яго словах, сёння з Рэспублікай Беларусь заключаны 682 інвестыцыйныя дамовы (усяго было 693, з іх 8 — скасаваныя), ацэначная сума інвестыцый па іх — на ўзроўні 13,9 мільярда долараў. Кірыл Карацееў выказаў меркаванне, што «гэта даволі значная сума, таму можна казаць пра паспяховую выбраную палітыку ўвядзення такога інструмента, як інвестыцыйная дамова». Ён жа патлумачыў і асноўныя новаўвядзенні, якія будуць чакаць інвестара пасля набыцця моцы Дэкрэта №4 (з 9 жніўня 2011 года):

— Дэкрэт №4, па-першае, спрашчае парадак заключэння дамоў. Раней у нас была трохузроўневая сістэма іх заключэння: першы ўзровень — гэта органы дзяржкіравання (узровень выканкамаў), другі — гэта тыя ж органы дзяржкіравання, але ўжо патрэбна было дэлегаванне паўнамоцтваў ад урада (патрабавалася прыняцце адпаведнай пастановы), і трэці — гэта калі дамовы заключаліся ўрадам па ўзгадненні з Прэзідэнтам. Практыка працы паказала, што інвестары трохі не разумелі адрознення паміж першым і другім узроўнямі: калі трэба было прымаць пастанову ўрада, а калі орган дзяржкіравання мог сам заключаць інвестыцыйную дамову. Таму зараз застаецца два ўзроўні: першы, калі такія інвестыцыйныя дамовы заключаюцца непасрэдна органамі дзяржкіравання (выканкамамі), і другі — калі такія дамовы заключаюцца ўрадам па ўзгадненні з Прэзідэнтам. Гэты другі ўзровень будзе мець месца, калі для інвестыцыйнага праекта патрабуюцца нейкія дадатковыя льготы і прэферэнцыі, якія не прадугледжаны дзейным заканадаўствам.

Разам з тым, згодна з Дэкрэтам №4, зараз пашыраны пакет ільгот і прэферэнцый для ўсіх інвестараў. Прынамсі, інвестары змогуць выкарыстоўваць праектную дакументацыю, падрыхтаваную за мяжой (пры ўмове, што замежныя нормы праектавання і стандарты ўжо ўведзены ў дзеянне на тэрыторыі Беларусі), атрымаюць права выліку поўнай сумы ПДВ, заплачанага пры набыцці тавараў (прац, паслуг) і маёмасных правоў, а таксама інвестары атрымаюць шэраг вызваленняў: не будуць плаціць адлічэнні ў інавацыйны фонд, не будуць плаціць ПДВ і падатак на прыбытак пры бязвыплатнай перадачы маёмасці (калі дзяржава бязвыплатна дае інвестару дзяржмаёмасць для рэалізацыі яго праекта), не будуць плаціць зямельны падатак і арэндную плату за ўчасткі, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці, на час будаўніцтва (і да 31 снежня наступнага года пасля заканчэння будаўніцтва) і на час правядзення праектных прац, не будуць праводзіць падрадныя таргі пры выбары праектных арганізацый і падрадчыкаў.

— Гэта тыя самыя льготы і прэферэнцыі, якіх не хапала інвестару за час працы Дэкрэта №10. Гэта тыя правы, якія ён хацеў атрымаць і па якія звяртаўся ў адпаведныя органы. Мы прааналізавалі гэтыя звароты, указы, прынятыя па буйных праектах, і ўвялі адпаведны пакет ільгот у Дэкрэт №4, — сказаў начальнік галоўнага ўпраўлення інвестыцый Мінэканомікі.

Ёсць яшчэ адно новаўвядзенне ў Дэкрэце №4, але яно ўжо накіравана на пэўнае абмежаванне інвестараў. Гаворка ідзе пра здзелкі з зямлёй да моманту рэгістрацыі правоў на аб'екты, стварэнне якіх прадугледжана непасрэдна інвестыцыйнай дамовай.

— Чаму такое абмежаванне ўведзена? Бо практыка паказала, што меў месца шэраг злоўжыванняў пры заключэнні інвестыцыйных дамоў: некаторыя з гэтых дамоў органы дзяржкіравання вымушаны былі скасаваць, па некаторых яшчэ ідзе разбор. Інвестар, карыстаючыся нормамі дэкрэта, атрымліваў пэўныя льготы пры заключэнні інвестыцыйнай дамовы (вызваляўся ад платы за права заключэння дамовы арэнды, атрымліваў зямельны ўчастак без аўкцыёну) і пасля гэтага меў права ажыццяўляць з гэтым зямельным участкам пэўныя здзелкі. Дэкрэт №4 такія магчымасці спыняе, — патлумачыў Кірыл Юр'евіч.

Таксама ён праінфармаваў, што Міністэрства эканомікі падрыхтавала ўсе праекты пастаноў і іншых падзаконных актаў, якія накіраваны на рэалізацыю новых палажэнняў дэкрэта. Яны разгледжаны органамі дзяжкіравання і прадстаўлены ва ўрад:

— Таму 9 жніўня (калі набудзе моц Дэкрэт №4) мы атрымаем удасканалены механізм заключэння дамоў, а таксама новыя парадак, правы, магчымасці інвестараў, што, як мы лічым, станоўча адаб'ецца на прытоку інвестыцый.

### З 2005 ГОДА МЫ ЎПУСЦІЛІ ІНВЕСТЫЦЫЙ НА МІЛЬЯРД ДОЛАРАЎ?

Кірыл Карацееў таксама паведаміў, што хутка наша краіна зможа паўнавартасна пачаць працаваць са Шматбаковым агенцтвам па гарантыях інвестыцый (ШАГІ):

— Што гэта за агенцтва? Гэта адна з устаноў Групы арганізацый Сусветнага банка, якая займаецца страхаваннем палітычных некамерцыйных рызык. Да такіх рызык адносяцца страхаванне ад магчымай экспрапрыяцыі, ад нейкіх грамадзянскіх беспарадкаў, ад вайсковых дзеянняў, ад немагчымасці краінай выканаць свае абавязацельствы перад інвестарам. Наша краіна ўваходзіць у ШАГІ з 1992 года. Аднак можна казаць пра тое, што гэты механізм практычна ніколі, на жаль, не працаваў. За ўвесь час членства ў гэтай арганізацыі адбылася толькі адна здзелка (гэта было ў 2005 годзе), якая тычылася ўзаемаадносін «РайффайзенБанка» і стваранага з яго удзелам «Пріорбанка». Пасля гэтага на савеце дырэктароў ШАГІ былі прынятыя папраўкі і вылучаны ўмовы падпісання Рэспублікай Беларусь базавых пагадненняў пра выкарыстанне мясцовай валюты і аб прававой ахове гарантавання замежных інвестыцый (іх адсутнасць і стрымлівала ўсю працу з гэтым агенцтвам), — расказаў Кірыл Карацееў.

Аднак ён дадаў, што сёлета 27 чэрвеня быў падпісаны ўказ аб правядзенні перамоў па гэтых міжнародных дамовах, а 30 чэрвеня Палата Прадстаўнікоў прыняла праект Закона «Аб ратыфікацыі папраўак да Канвенцыі аб заснаванні Шматбаковага агенцтва па гарантыям інвестыцый», які Савет Рэспублікі потым ухваліў.

— Зараз гэты законапраект унесены на разгляд і падпісанне кіраўніку дзяржавы. Такім чынам, мы можам канстатаваць, што па гэтых базавых дакументах, якія з'яўляліся стрымліваючым фактарам, сёння праца набліжаецца да фінішу і літаральна пасля праходжання ўсіх унутрыдзяржаўных працэдур Беларусь можа пачаць паўнавартасна працаваць з гэтай установай. Што гэта дае нашай краіне? Па-першае, паводле інфармацыі, якую прадставіла нам ШАГІ, з 2005 года ў яго адрас паступіла заявак на страхаванне праектаў на суму больш за 1 мільярд долараў. Такім чынам у той ці іншай ступені ўпэўненасці можна казаць, што гэта аб'ём недаатрыманых прамых інвестыцый у эканоміку краіны. Бо з-за адсутнасці тых пагадненняў, пра якія я казаў, агенцтва не магло выступіць гарантам па іх, і такія праекты або не ажыццяўляліся, або вымушаны былі шукаць нейкае іншае забеспячэнне абавязацельстваў. Другі практычны момант карысці працы з ШАГІ — гэта адсутнасць неабходнасці выдачы гарантый Рэспублікі Беларусь па знешніх запазычаннях. Бо не сакрэт, што такія гарантыі павялічваюць велічыню знешняга доўгу краіны, таму магчымасць працаваць без такіх гарантый пазітыўна адаб'ецца на працы з нашай запазычанасцю. Ну і па-трэцяе: мы маем непасрэдна іміджавы момант — паўнавартасны ўдзел Беларусі ў Шматбаковым агенцтве па гарантыях інвестыцый будзе сігналам інвестару пра тое, што мы выкарыстоўваем прынятыя ва ўсім свеце механізмы абароны інвестыцый і зрабілі ўсё магчымае, каб гэтая абарона ажыццяўлялася, — сказаў Кірыл Карацееў і дадаў, што нашы краіны-суседзі ўжо ратыфікавалі гэтыя папраўкі, таму нам неабходна быць канкурэнтаздольнымі ў дачыненні да іх.

### ІНВЕСТАРАМ СТАНЕ ЛЁГКА І ПРЫЕМНА?

Дарэчы, зусім нядаўна ў Беларусі пачало працаваць Нацыянальнае агенцтва інвестыцый і прыватызацыі — 28 чэрвеня на пасаду дырэктара гэтага агенцтва быў прызначаны **Дзмітрый КЛЕЎЖЫЦ**. Ён таксама падзяліўся з журналістамі сваім бачаннем інвестыцыйнай прывабнасці Беларусі:

— Нацыянальнае агенцтва інвестыцый і прыватызацыі пачало сваю працу. Не магу сказаць, што ў поўным маштабе, бо ў нас пакуль недастаткова персаналу. Хачу сказаць, што агенцтва чакалі ўсе — і на ўрадавым узроўні, і бізнэс.

Дзмітрый Клеўжыц расказаў, што на сёння структура агенцтва складаецца з двух блокаў — прыватызацыі і прыцягнення інвестыцый, а таксама адзначыў, што для працы ў агенцтве будуць прыцягнуты першакласныя эксперты.

— Беларусь вельмі цікавая з пункту гледжання інвестара. Адзіная перашкода (калі казаць пра прыватызацыю) — гэта недастатковае інфармацыйнае забеспячэнне патэнцыйных інвестараў. Бо яны бачаць назву нейкага прадпрыемства, але не разумеюць сутнасці яго дзейнасці. Яны б хацелі бачыць глыбіню, больш шырокую інфармацыю пра гэтую кампанію. Таму калі ўсходні вектар праяўляе нейкую актыўнасць, то заходні пакуль яшчэ маўчыць. Таму ў працы з заходнім вектарам трэба будзе актывізавацца. І агенцтва павінна паказаць тут свае здольнасці.

Ён таксама паведаміў, што Нацыянальнае агенцтва інвестыцый і прыватызацыі будзе суправаджаць інвестара на ўсіх этапах яго прысутнасці ў краіне.

— Інвестар павінен зразумець ад узаемадзеяння з намі наступнае: чаму так лёгка і прыемна працаваць у Беларусі. Гэта самая галоўная мэта. Без гэтага агенцтва будзе неэфектыўным. А які сэнс займацца тым, што апрыёры не можа быць эфектыўным? Мы будзем займацца тым, дзе мы бачым перспектыву. А перспектывы ў агенцтва маштабныя: яно стане «адным акном» для сённяшніх і патэнцыйных інвестараў.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

# КАБ НЕ СПЫНІЦЬ ТВОРЧАГА ІМКНЕННЯ



Многія выпускнікі факультэта журналістыкі БДУ, як беларускія, так і замежныя, нездарма лічаць доктара гістарычных навук, прафесара кафедры гісторыі журналістыкі Алега Слуку «сваім» дэканам. На гэтай пасадзе ён знаходзіўся ў няпросты час перабудовы і галоснасці. Складаныя палітычныя працэсы праходзілі праз лёсы студэнтаў і выкладчыкаў. Помніцца, як нас, студэнтаў, якія вельмі эмацыянальна рэагавалі на падзеі таго часу і нават збіраліся накіраваць свой калектыўны зварот у Маскву, Алег Георгіевіч спрабаваў пабацькоўску пераканаць у тым, што найбольш важныя рашэнні не прымаюцца на гарачую галаву. Але якія б гарачыя галовы ў нас ні былі і ў якія б сітуацыі па сваёй маладосці мы ні траплялі, ад пагрозы адлічэння нас выратоўваў мудры дэкан. «Я заўсёды лічыў, што маладога творчага імкнення нельга бяздумна спыняць, — гаворыць і сёння Алег Слука. — Таму двойкі прынцыпова ніколі не ставіў. Лайдака такім чынам нічому добраму не навучыш, а здольнаму студэнту можна сапсаваць увесь смак ад атрыманых ведаў». Пад кіраўніцтвам Алега Георгіевіча на факультэце журналістыкі быў створаны новы вучэбны план і распрацавана праграма вывучэння студэнтамі тэорыі і практыкі беларускіх СМІ. Адметна і тое, што ў пераломны перыяд на самым ідэалагічным факультэце ўніверсітэта ўзнікла міжнароднае аддзяленне, на якім вучыліся замежныя студэнты з В'етнама, Афганістана, Беніна, Непала, Палесціны і многіх іншых краін.

З цягам часу Алег Слука набыў вядомасць як навуковец, які плённа распрацоўвае гісторыка-філасофскую праблематыку нацыянальнай ідэі. На пасадзе памочніка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь яму была даручана праца па навукова-тэарэтычным абгрунтаванні асноў ідэалогіі дзяржаўнасці. Назвы манаграфій, прысвечаныя гэтай тэматыцы, гавораць самі за сябе: «Нацыянальная ідэя — шлях народа» (2005), «Ідэалогія беларускай дзяржаўнасці (метадалогія фарміравання)» (2007), «Нацыянальная ідэя» (2008), «Ідэалагічныя працэсы на Беларусі» (2010) і іншыя. Алег Георгіевіч прызнаецца, што яму пашанцавала заняцца такім новым і запатрабаваным напрамкам у беларускай гуманітарнай навуцы, як даследаванне ідэалагічных працэсаў. Бо ідэалогія, на яго думку, якраз і ёсць той інструмент, пры дапамозе якога могуць паспяхова рэалізавацца сацыяльна-эканамічныя праграмы.

На пасадзе намесніка міністра адукацыі Беларусі Алегу Георгіевічу давялося займацца рэарганізацыяй адукацыйнай сістэмы. Ён стаў арганізатарам распрацоўкі новай канцэпцыі развіцця навукі ва ўніверсітэтах нашай краіны, прымаў непасрэдны ўдзел у правядзенні рэформы сярэдняй адукацыйнай школы.

Алег Слука ніколі не парываў сувязяў з родным факультэтам. На працягу амаль 10 гадоў навуковых даследаванняў ён сабраў вялікі гістарычны матэрыял і на яго аснове выдаў трохтомны вучэбны дапаможнік «Беларуская журналістыка», які атрымаў грыф Міністэрства адукацыі. За гэтую творчую працу сёлета ён быў уганараваны званнем лаўрэата прэміі Саюза журналістаў Беларусі «Залатое пяро». Сёння прафесара кафедры гісторыі журналістыкі Інстытута журналістыкі БДУ Алега Слуку па праву лічаць стваральнікам фундаментальнай гісторыі нацыянальнай камунікацыі.

У гэтым годзе ў серыі «Класічнае ўніверсітэцкае выданне» з друку выйдзе яго аднатомнік па гісторыі беларускай журналістыкі, які стане адным з першых падручнікаў па спецыяльнасці «Журналістыка» на постсавецкай прасторы. За журналісцкую, навуковую і педагагічную дзейнасць Алег Георгіевіч удастоены ганаровых званняў «Выдатнік друку» і «Выдатнік адукацыі» Рэспублікі Беларусь. У дзень свайго 70-годдзя прафесара Алега Слуку вельмі радуе тое, што сярод студэнтаў, якім ён выкладае, большая частка — здольныя і мэтанакіраваныя юнакі і дзяўчаты. «Яны ведаюць, што робяць на факультэце журналістыкі і што менавіта ім патрэбна для будучай прафесіі», — зазначае Алег Георгіевіч. «Журналістыка — прафесія па-грамадзянску адказная. Яна з'яўляецца стваральнай сілай, адным з моцных фактараў духоўнага багацця грамадства і сацыяльна-эканамічнага інавацыйнага развіцця. Сучасныя студэнты гэта ўсведамляюць», — упэўнены прафесар.

**Ганна ЛАГУН.**

**У журналістыцы можна быць па-рознаму: можна працаваць у газеце, існаваць згодна з прынцыпам «Ні дня без радка». Але ў журналістыцы можна быць, навучаючы тых, хто потым пойдзе працаваць у СМІ. Прафесар, доктар гістарычных навук Алег Георгіевіч Слука стаў настаўнікам для многіх журналістаў, у тым ліку з нашых «звяздоўскіх» шэрагаў. Гісторыя беларускай журналістыкі для яго — гэта найперш працэс, які ён назірае і даследуе як навуковец. Але гэта не толькі пэўная дысцыпліна, лекцыі, заняткі са студэнтамі. Гэта яшчэ і частка жыцця, у якім для Алега Георгіевіча выпаў шанц асабіста паўплываць на гэты працэс: ён быў дэканам факультэта журналістыкі БДУ ў пераломны момант, калі ішла перабудова не толькі сацыяльнай сістэмы, але і свядомасці людзей, а сродкі масавай інфармацыі павінны былі адлюстроўваць, асэнсоўваць і падсумоўваць тое, што адбывалася ў грамадстве. З гэтымі словамі блаславення на прафесію ад дэкана многія з нас атрымлівалі дыпломы. І дагэтуль працуюць у журналістыцы, разумеючы важнасць і вартасць слова. Так, з гадамі наша ўяўленне пра журналістыку пашыралася, шліфавалася, удасканальвалася. Але пры гэтым кожны з нас, вучняў Алега Георгіевіча Слукі, усё-такі адчувае сябе часткай вялікага працэсу — існавання беларускай журналістыкі — які пачаўся задоўга да нас і будзе працягвацца пасля нас, праз тых, хто захоча вучыцца пісаць пра Беларусь. З юбілеем!**

**Звяздоўцы.**

# НІ ГРЫБОЎ, НІ ГРЫБНІКА

Будзь пільным!

**НА мінулым тыдні ў міліцыю звярнулася жыхарка Пінскага раёна. Яна расказала, што яе сыны — 9 і 11 гадоў — пайшлі ў лес і не вярнуліся. Увесь асабовы склад Пінскага РАУС быў падняты па трывозе. Пошукі працягваліся цэлую ноч. На шчасце, на наступны дзень хлопцаў знайшлі на забалочаным участку за тры кіламетры ад месца знікнення. Жыццю і здароўю вандроўнікаў нішто ўжо не пагражае.**

Ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС адзначаюць, што летась было зарэгістравана 118 падобных фактаў. Большасць з іх звязана з асобамі сталага ўзросту. Толькі 62 чалавекі вярнуліся або адшукаліся ў выніку пошукавых мерапрыемстваў. Нярэдка такія блуканні заканчваюцца лятальным зыходам. Летась — 31 выпадак, 21 з якіх — на тэрыторыі Мінскай вобласці. Так, напрыканцы кастрычніка 2010 года пайшоў у лес у грыбы 71-гадовы жыхар Ушацкага раёна Віцебскай вобласці. Нядаўна астанкі мужчыны былі знойдзены ў суседнім раёне, за 15 км ад месца знікнення. Зараз у вышуку знаходзяцца 130 чалавек, чыё знікненне звязана з паходам у лес у грыбы і ягады, з іх 98 — людзі сталага веку.

**Супрацоўнікі крымінальнага вышуку распрацавалі памятку аб тым, як правільна арганізаваць свой паход у лес:**

**1.** Калі вы сабраліся ў лес, абавязкова паведаміце пра гэта сваякам ці суседзям. Скажыце, у якім раёне збіраецеся шукаць грыбы-ягады. Звярніце ўвагу, якія буйныя арыенціры знаходзяцца паблізу: рака, дарога або чыгуначная станцыя.

**2.** Калі ў вас ёсць сотавы тэлефон, вазьміце яго з сабой. Аднак больш надзейным сродкам, асабліва там, дзе можа адсутнічаць сотавая сувязь, будзе свісток. Так што прыхапіце і яго. Рэкамендуецца ўзяць з сабой і ежу, цёплыя рэчы, а таксама нож і компас.

**3.** Не забывайцеся пра неабходныя лекі, запалкі, дажджавік і нават невялічкі запас грошай. Абутак павінен быць зручным, а адзенне — як мага больш яркае. Камуфляжная форма, старыя курткі зліваюцца з дрэвамі і ўскладняюць пошук.

**4.** Калі вы заблукалі, не панікуйце. Шукайце любую сцежку, просеку або лінію электраперадач. Калі знайшлі арыенцір, трымайцеся яго і нікуды не зварочвайце. Ніколі не пераходзьце вадаём, раку, ручай і, тым больш, балота. Заўсёды больш надзейна ісці ў процілеглы ад іх бок.

**5.** Калі стане відавочным, што заначаваць давядзецца ў лесе, распаліце вогнішча на высокім месцы, паблізу вялікага дрэва. Ляжаць варта тварам да вогнішча і пры гэтым пастарацца не спаць. Магчыма, да вас ідзе дапамога, а вы яе праспіце.

**6.** Калі нехта з вашых знаёмых не вярнуўся дадому з лесу, неабходна выклікаць работніка міліцыі, а не працягваць пошук сваімі сіламі! Не адкладвайце званок надоўга, каб не спазніцца.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## Абзац

◢ Дзядуля і яго 5-гадовы ўнук загінулі на рацэ Дрыса ў Верхнядзвінскім раёне. Трагедыя здарылася ў вёсцы Валынцы. У госці да сямейнай пары прыехала шматлікая радня з Наваполацка. 64-гадовы дзядуля з двума ўнукамі і ўнучкай пайшлі на рэчку. Дзеці захацелі пакупацца, але калі яны акунуліся ў ваду, то моцнае цячэнне падхапіла дваіх 5-гадовых дзяцей. Дзядуля кінуўся на дапамогу, але ўпаў мёртвым. На крыкі 9-гадовага хлопчыка збегліся родныя, аднак з вады ўдалося выцягнуць толькі дзяўчынку, яе брат патануў.

◢ **Два чалавекі загінулі на вадаёмах Мінска за адзін дзень. Пенсіянерка 1928 г.н. патанула 9 ліпеня, калі купалася ў Камсамольскім возеры з боку Старавіленскага тракта. Людзі, якія былі на беразе, бачылі, як у вадзе жанчына махала рукамі, спрабавала нешта крычаць. Мужчыны кінуліся на дапамогу пенсіянерцы, выцягнулі яе, спрабавалі рабіць рэанімацыйныя мерапрыемствы, але беспаспяхова. А ў канале Сляпянскай воднай сістэмы, у месцы, непрыстасаваным для купання, патануў 53-гадовы мінчанін. Разам з сябрамі ён адпачываў на востраве. Калі сталі ўплаў вяртацца назад на бераг, мужчына пачаў тануць. Выратаваць яго сябрам не ўдалося. Праверку праводзіць пракуратура.**

◢ У Ельску кіроўца легкавога аўтамабіля на пешаходным пераходзе, што не рэгулюецца, наехаў на мужчыну 1979 г.н. і жанчыну 1986 г.н., якія ад атрыманых траўмаў памерлі. Трагедыя адбылася ў 3 гадзіны ночы. Згодна з папярэдняй інфармацыяй, дзяўчына, што працавала ў вулічным кіёску, зачыніла яго і ў суправаджэнні знаёмага накіравалася дадому. На пераходзе іх збіў аўтамабіль. Удар быў такой моцы, што цела загінулай аказалася за 25 м ад месца здарэння. З месца аварыі кіроўца збег. Супрацоўнікі ДАІ практычна па слядах машыны выйшлі на вінаватага. Спачатку яны знайшлі «Фальксваген Пасат», кінуты ў наваколлі Мазырскага раёна, а потым — і яго ўладальніка, 1986 г.н.

◢ **У адным з дачных таварыстваў Гомельскай вобласці мужчына пачаў страляць з абрэза. У міліцыю звярнулася яго жонка. Яна расказала, што пасля сямейнай спрэчкі муж дастаў з дачнага дома прадмет, падобны да абрэза паляўнічага ружжа і тройчы стрэліў у паветра. Пасля гэтага ён сеў у машыну і з'ехаў. Міліцыя затрымала мужчыну, канфіскавала абрэз і 5 патронаў. Заведзена крымінальная справа.**

## Поўны абзац

◢ Зніклы папугай сам прыляцеў у таварыства аховы жывёл. Хвалісты папугайчык па мянушцы Берт паляцеў з дому і адсутнічаў на працягу шасці дзён. Гаспадары птушкі звярнуліся ў Каралеўскае таварыства аховы жывёл па дапамогу ў пошуках Берта, тым больш што яго сяброўка па мянушцы Лола моцна сумавала па партнёры — перастала есці, выходзіць з клеткі і гуляць. Відаць, папугай і сам засумаваў па Лоле, таму што самастойна прыляцеў у той самы цэнтр абароны жывёл, у які звярнуліся яго гаспадары.



*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

**Извещение о проведении 12 августа 2011 года открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «ГУМ»**

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование и сведения о продаваемом имуществе)** | Административное здание. Литер А2/к (двухэтажное кирпичное административно-хозяйственное здание общей площадью 286.0 кв.м, инвентарный номер 500/С-1995) |
| **Сведения о земельном участке** | Кадастровый номер 500000000007000355, площадь 0,0291 га, целевое назначение: обслуживание административного здания |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | г. Минск, ул. Раковская, д. 32 |
| **Сведения об организаторе аукциона (продавце)** | ОАО «ГУМ», пр. Независимости, 21, 220030, г. Минск, телефоны: (017) 226 14 45, (017) 227 10 92 |
| **Начальная цена предмета торгов** | 1 942 489 200 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 190 000 000 белорусских рублей |
| **Наличие обременений** | Аренда |
| **Условие продажи** | При приобретении права собственности на продаваемое имущество победитель торгов (покупатель) обязуется в течение одного месяца подписать охранное обязательство в соответствии с требованиями закона Республики Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» |

Торги проводятся в порядке, установленном положением «О порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ГУМ» (далее – Положение) от 16.06.2011.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с Положением.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012740089012 в отд. № 539 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, код 739, получатель – ОАО «ГУМ», УНП 100063737.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона и включает НДС по ставке 20 процентов.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, осуществляется участником, выигравшим торги.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 10 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 30 календарных дней с даты заключения договора купли-продажи.

Аукцион состоится **12 августа 2011 года** в 12 часов 00 минут по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 21, учебный класс. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 12.07.2011 по 10.08.2011 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 12.00 и с 12.30 до 17.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 21, каб. 18.

**Телефоны для справок: (017) 226 14 45, (017) 227 10 92.**

**ОБЪЯВЛЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ХОЗЯЙСТВЕННЫМ СУДОМ ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ по продаже имущества, принадлежащего гр-ну Григорьеву Сергею Арсентьевичу.**

**На торги выставляется следующее имущество:**

**Лот № 1**. Прицеп СЗАП 8357, регистрационный номер 6566 ВА, 1992 года выпуска, первоначальная стоимость 10 963 200 рублей с учетом НДС.

**Время проведения торгов — 05 августа 2011 года в 11.00.**
**Торги будут проводиться по адресу: г. Витебск, ул. Правды, д. 32, каб. 304.**

Минимальная величина первого шага торгов составляет 5% стоимости лота.

Лицо, желающее принять участие в торгах, не позднее последнего рабочего дня перед торгами обязано:

- подать заявку на участие в торгах;
- дать подписку об отсутствии препятствий, предусмотренных законодательством, для приобретения имущества;
- внести задаток в размере 10% от первоначальной стоимости лота на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области р/с № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «СБ Беларусбанк» г. Витебска, код 259, УНП 300007670.

Сумма, внесенная лицом, купившим с торгов имущество, зачисляется в счет покупной цены. Остальным участникам торгов внесенные ими суммы возвращаются в течение пяти рабочих дней со дня проведения торгов. Победитель торгов обязан возместить затраты суда на организацию и проведение торгов.

**По вопросам проведения и участия в торгах следует обращаться в хозяйственный суд Витебской области (г. Витебск, ул. Правды, 32), также по телефонам: тел./факс (8 0212) 49 13 48, тел. м. +37544 767 83 00 судебный исполнитель Трашков Игорь Сергеевич, (8 0212) 49 13 40 старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, дополнительная информация содержится на сайте хозяйственного суда Витебской области http://court.by, e-mail: vitsud@tut.by.**

Водбліскі «Базару»

# БЕЛАРУСЫ ЗАМЕЖЖА ЎПЕРШЫНЮ НА «БАЗАРЫ» ПРАДСТАВІЛІ КУЛЬТУРНУЮ ПРАГРАМУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



## Беларусам трэба «быць на сувязі»

У Віцебску адбылося другое пасяджэнне вышэйназванай кансультацыйнай рады. Як расказаў «Звяздзе» **міністр культуры Беларусі Павел ЛАТУШКА**, у склад рады ўваходзяць прадстаўнікі практычна ўсіх міністэрстваў і ведамстваў, якія адказныя за супрацоўніцтва з беларусамі замежжа. У Віцебску абмяркоўвалі перспектывы супрацоўніцтва з суполкамі беларускіх арганізацый, якія дзейнічаюць за мяжой у культурнай, інфармацыйнай, эканамічнай сферах.

— Мы зацікаўлены ў тым, каб падтрымліваць разнастайныя культурныя акцыі беларусаў, што адбываюцца за мяжой. Зацікаўлены прысылаць беларускія калектывы, аказваць фінансавую падтрымку беларускім грамадскім арганізацыям замежжа ў набыцці касцюмаў, інструментаў, літаратуры і гэтак далей, — падкрэсліў міністр.— Зразумела, для нас вельмі важна, каб беларусы прыязджалі на Бацькаўшчыну. І правядзенне першага фестывалю беларусаў замежжа, які праходзіў у Мінску і Віцебску, з'яўляецца вельмі яскравым сведчаннем рэалізацыі зацікаўленасці пастаяннага супрацоўніцтва. Важна, каб беларусы, якія пражываюць у нашай краіне, таксама ведалі, што адбываецца ў замежных суполках беларусаў: як яны падтрымліваюць беларускае слова, культуру, як ладзяць разнастайныя культурныя мерапрыемствы.

На пасяджэнні кансультацыйнай рады міністр культуры адзначыў, што вельмі важным пытаннем з'яўляецца абмеркаванне дзяржаўнай праграмы супрацоўніцтва з беларусамі замежжа. На працягу бягучага года будзе распрацаваны адпаведны праект урадавай праграмы. У ліку іншага прапрацоўваюцца магчымасці адкрыцця культурных цэнтраў Беларусі за мяжой у дадатак да ўжо існуючага цэнтра ў Польшчы. Плануецца адкрыццё такіх цэнтраў у Маскве, Кіеве, Вільнюсе і Берліне.

Удзельнікі пасяджэння падтрымалі прапанову аб правядзенні дзён культуры Беларусі за межамі нашай краіны, сумеснай дзейнасці па арганізацыі святкаванняў важных і знакавых для ўсіх беларусаў юбілеяў, такіх як 120-годдзе з дня нараджэння Максіма Багдановіча, якое сёлета адзначаем, юбілеяў Коласа і Купалы. Вельмі важна, каб адкрываліся мемарыялы і помнікі, звязаныя з нашай гісторыяй і культурай па-за межамі Беларусі. Напрыклад, неабходна абмеркаваць магчымасць усталявання помніка Купале і Коласу ў Варшаве. Гэтыя і іншыя знакавыя праекты без падтрымкі беларусаў замежжа немагчымыя.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Міхаіл Мясніковіч: «Фестываль беларусаў свету будзе садзейнічаць захаванню сувязяў з радзімай»

**Аб гэтым гаворыцца ў прывітанні прэм'ер-міністра Беларусі Міхаіла Мясніковіча, якое было зачытана перад пачаткам гала-канцэрта калектываў мастацкай самадзейнасці на «Славянскім базары ў Віцебску», паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.**

«Выказваю словы сардэчнай удзячнасці кіраўнікам і актывістам грамадскіх аб'яднанняў беларусаў замежжа, беларускім аматарскім калектывам і выканаўцам за самаадданую працу на ніве захавання і папулярызацыі беларускай культуры ў свеце, — гаворыцца ў прывітанні. — У Беларусі ведаюць аб вашых дасягненнях і ганарацца імі. Кожны з вас з'яўляецца не проста часцінкай радзімы за мяжой, але таксама прадстаўніком народнай дыпламатыі, які помніць гістарычныя карані і з гонарам дэманструе багатую культуру і традыцыі беларускага народа».

**Міністр культуры Павел ЛАТУШКА** таксама вітаў беларусаў, якія пражываюць у розных краінах свету і помняць гістарычную радзіму. «Для нас вельмі важна, каб вы захоўвалі нашы традыцыі, культуру, каб існавала сувязь паміж вамі і радзімай», — сказаў міністр. Паводле яго слоў, Мінкультуры мае намер і ў далейшым развіваць кантакты ў сферы культуры і мастацтва з самадзейнымі аматарскімі калектывамі, паэтамі і пісьменнікамі, мастакамі — беларусамі, якія пражываюць за мяжой.

Фестываль мастацтваў беларусаў свету праходзіў на «Славянскім базары ў Віцебску» ўпершыню.





## У нядзелю на «базары» правіў баль Дзень Саюзнай дзяржавы

— Фестываль у Віцебску — своеасаблівая дэманстрацыя нашага адзінства, духоўнасці, — адзначыў на прэс-канферэнцыі **дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Павел БАРАДЗІН**. — І той факт, што на яго з задавальненнем прыязджаюць таленты з розных кантынентаў, у тым ліку і «зоркі» сусветнай велічыні, — добрае пацвярджэнне таго, што фестываль — вельмі цікавая культурная падзея.

Павел Барадзін паабяцаў абмеркаваць магчымасць павелічэння фінансавання «базару» ў 2-3 разы. Саюзная дзяржава ўдзельнічае ў фінансаванні фестывалю з 1998 года. З пачатку 2000-х гадоў штогадовае фінансаванне з саюзнага бюджэту — на ўзроўні 25 мільёнаў расійскіх рублёў.

Дзяржаўны сакратар таксама не выключае, што прэміі Саюзнай дзяржавы можна ўручаць і высокапрафесійным урачам, навукоўцам, а не толькі майстрам у галіне літаратуры і мастацтва. Такая магчымасць будзе прапрацоўвацца.

Падчас наведвання Віцебскай вобласці Павел Барадзін у Лепельскім раёне наведаў дзве сям'і, у якіх выхоўваюцца прыёмныя дзеці. Дружным сем'ям падарылі грошы — 15 мільёнаў рублёў — і камп'ютары. Не застаўся без падарункаў і дзіцячы рэабілітацыйна-аздараўленчы цэнтр «Жамчужына», таксама ў Лепельскім раёне, дзе праходзяць рэабілітацыю дзеці не толькі з Беларусі, але і з Расіі, з раёнаў, якія найбольш пацярпелі ў выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Барыс Грызлоў: «Славянскі базар у Віцебску» выйшаў за рамкі славянскай культуры і стаў інтэрнацыянальным

**Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» выйшаў за рамкі славянскай культуры і стаў інтэрнацыянальным, сказана ў прывітанні старшыні Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, старшыні Дзяржаўнай Думы Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі Барыса Грызлова XX Міжнароднаму фестывалю мастацтваў, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ва ўпраўленні ідэалагічнай работы Віцебскага аблвыканкама.**

На працягу дваццаці гадоў фестываль займае пачэснае месца ў сэрцах тых, хто даражыць спадчынай славянскай культуры, падзяляе ідэі яднання народаў і гуманізму. Дэпутаты Парламенцкага сходу ўдзяляюць асаблівую ўвагу захаванню і развіццю адзінай культурнай прасторы Расіі і Беларусі. Агульныя культуры і гісторыя нашых народаў з'яўляюцца залогам паспяховага будаўніцтва Саюзнай дзяржавы, гаворыцца ў прывітанні.

«Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» ўжо даўно выйшаў за рамкі толькі славянскай культуры і стаў інтэрнацыянальным, ператварыўшыся ў прэстыжную пляцоўку для таленавітых выканаўцаў, якія прадстаўляюць розныя культуры», — адзначана ў віншаванні Барыса Грызлова.

## Прэзідэнт Расіі не накіраваў віншаванне з адкрыццём XX юбілейнага «Славянскага базару ў Віцебску»

**Прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў не накіраваў віншаванне ў сувязі з адкрыццём юбілейнага XX Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі арганізатары фестывалю.**

Традыцыйна ў мінулыя гады прэзідэнты Расіі і Украіны накіроўвалі віншаванні гасцям і ўдзельнікам «Славянскага базару» ў сувязі з адкрыццём фестывалю.

У гэтым годзе віншаванне атрымана толькі ад прэзідэнта Украіны Віктара Януковіча.

## Маланка разбіла машыну Іны Афанасьевай



**Маланка пашкодзіла машыну папулярнай беларускай спявачкі Іны Афанасьевай, якая прыехала на «Славянскі базар». З ёю і яе блізкімі ўсё ў парадку. Пра здарэнне карэспандэнту БЕЛТА расказала сама Іна Афанасьева.**

Трапічны лівень з громам і маланкай, які 9 ліпеня абрушыўся на фестывальны Віцебск, стаў прычынай здарэння. Іна са сваімі блізкімі прыехала ў Віцебск на ўласнай машыне, каб прыняць удзел у гала-канцэрце майстроў мастацтваў Беларусі. Сям'я Афанасьевай вырашыла не чакаць у машыне, пакуль пройдзе навальніца, і паднялася ў нумар, пакінуўшы аўтамабіль на стаянцы. Гэта і ўратавала іх. Паводле слоў спявачкі, маланка ўдарыла ў празрысты дах «Хонды», разбіла шкло і прапаліла багажнік.

Ратаваць аўтамабіль кінуліся калегі па пеўчым цэху: Анатоль Ярмоленка, муж Іскуі Абалян. «На стаянцы такое рабілася: машыну проста залівала, калі б не дапамога сяброў, яна, напэўна, паплыла б», — расказала Іна Афанасьева.

Паводле прызнання Іны, гэта непрыемнасць не азмрочыла яе знаходжанне на юбілейным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Самае галоўнае для яе, што ўсё ў парадку з яе блізкімі. «Машына — гэта толькі жалеза, слава богу, што мы жывыя і здаровыя».

Трапічныя лівні з навальніцамі абрушваюцца на фестывальны горад, не парушаючы дваццацігадовай традыцыі: амаль кожны фестываль праходзіць пад акампанемент дажджу.

## НАШЫМ ДЗЯЎЧЫНКАМ — СЯМЁРКІ!



**На «базары» ў дзіцячым конкурсе бяруць удзел юныя выканаўцы з 20 краін. Нашу краіну прадстаўляюць Аня і Саша з Мінска.**

Сёлета арганізатары жараб'ёўкі падарылі ўдзельнікам конкурсу казку. Літаральна!

У парку культуры і адпачынку на ўскраіне Віцебска дзятва апынулася ў казцы «Аліса ў краіне цудаў». Да гэтага ўчынілі падарожжа па Заходняй Дзвіне на цеплаходзе «Паўночная сталіца».

Героі казкі сустракалі хлопчыкаў і дзяўчынак на беразе каля прычала. Дзецям паказалі сваё майстэрства аматары коннага спорту, малыя змаглі пагуляць з казачнымі героямі ў кракет, у пернікавым доме выбіралі пры дапамозе «казачнага посуду» нумары сваіх выступленняў.

У першы дзень конкурсу Ганна Атрошчанка выступіць чатырнаццатай, а ў другі — сёмай. Аляксандра Няхай адпаведна сёмай і дваццатай. Пра сямёрку яна марыла.

— Мы выйгралі адборачны нацыянальны тур, таму і трапілі на «базар», — не без гонару расказвае «Звяздзе» Ганна Атрошчанка. — Вядома, разлічваю на перамогу. На конкурс прыехала з мамай і кіраўніком студыі, у якой займаюся. Два касцюмы мне сшылі дызайнеры...

— Я вельмі хачу перамагчы. І мару, каб дастаўся сёмы нумар, які для мяне шчаслівы, — расказала яшчэ да жараб'ёўкі Аляксандра Няхай. І выбрала сёмы нумар!!! — На фестываль прыехала разам з татам і мамай. Не, яны не музыканты. Я першая артыстка ў сям'і...

Старшыня журы 9-га міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск — 2011», заслужаны артыст Расіі Сяргей Шусціцкі ў размове з карэспандэнтам «Звязды» адзначыў, што на «базары» ў журы ўпершыню. Раней быў старшынёй журы на іншых конкурсах: акцёрскай песні, на капусніках і гэтак далей.

— Я шчаслівы пасля перапынку прыехаць на віцебскі фестываль, — расказвае ён. — Фестываль для мяне сапраўды родны. 15 гадоў я рыхтаваў фестывальныя дзённікі. Усяго 22 гады правёў на фестывалі. Адказнасць узначальваць журы неверагодная. Але не сумняваюся, што мы будзем судзіць сэрцам, сумленнем. Галоўная наша задача — разгледзець талент. Каб і праз гады, калі юныя таленты вырастуць і стануць вялікімі артыстамі, мы маглі ўспомніць не без гонару, што ўсё адбылося менавіта так: мы разгледзелі талент і падтрымалі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.**

## Надвор'е

## ТЫДЗЕНЬ БУДЗЕ ЦЁПЛЫ, АЛЕ БЕЗ ДАЖДЖОЎ НЕ АБЫДЗЕЦЦА

**паведаміла БЕЛТА галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга ФЯДОТАВА.**

У сераду атмасферны ціск будзе расці, у асноўным чакаецца без ападкаў. Толькі па ўсходзе збяруцца кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Пры гэтым начная тэмпература ў цэлым па Беларусі будзе вагацца ад 10 да 18 градусаў. Днём ліпеньскае сонца прагрэе паветра да 28 градусаў цяпла.

У другой палове тыдня пройдуць кароткачасовыя дажджы з навальніцамі. Тэмпература зноў пачне павышацца, і днём 14 ліпеня яна дасягне 25 градусаў па поўдні, а па поўначы краіны — да 31.

Чарговы атмасферны фронт зноў пагоршыць умовы надвор'я. У начныя гадзіны месцамі, днём на большай частцы Беларусі прагназуюцца навальнічныя дажджы, у асобных раёнах моцныя. Пры навальніцах вецер можа ўзмацняцца парывамі да 15-20 метраў у секунду. Начная тэмпература складзе ад 13 да 20 градусаў цяпла. Днём прагназуецца ад 22 градусаў па паўночным захадзе да 31 градуса па паўднёвым усходзе Беларусі.

У бліжэйшыя выхадныя чакаюцца кароткачасовыя дажджы і навальніцы. У суботу ноччу 12-19 градусаў, днём — ад 20 да 27. Ноччу 17 ліпеня чакаецца плюс 9-16 градусаў, днём — ад 21 градуса цяпла па поўначы краіны да плюс 29 градусаў па поўдні.

Дыскусійная трыбуна

# ХМАРА




**У беларускім перакладзе з'явілася кніга нямецкай пісьменніцы Гудрун Паўзэванг «Хмара». Гэта вельмі актуальны для беларусаў фантастычны раман пра наступствы атамнай катастрофы ў адным з невялічкіх гарадоў Германіі. Яго пераклаў Уладзімір Папковіч, вядомы віцебскі паэт і перакладчык, які шмат гадоў адпрацаваў загадчыкам кафедры нямецкай мовы Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава. Раман быў напісаны ў 1987 годзе, акурат пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС. І тады карыстаўся неверагоднай папулярнасцю ў свеце. У 2010 годзе тыраж «Хмары» дасягнуў 1,5 мільёна экзэмпляраў, і раман трапіў у нямецкую школьную праграму. Пасля ядзернай катастрофы на японскай АЭС «Фукусіма-1» у сакавіку 2011 года раман Гудрун Паўзэванг ізноў трапіў у спіс бестселераў.**

Гудрун Паўзэванг засцерагае: хмара вісіць над кожным з нас, пакуль у свеце дзейнічае хоць адна атамная электрастанцыя. Няўжо гісторыя сапраўды нічому не вучыць?! Канкрэтныя беды, якія забралі жыцці тысяч і тысяч людзей... Калі не, тады гэтую функцыю бярэ на сябе мастацтва. Раман Гудрун Паўзэванг — гэта, напэўна, той твор, які павінен прачытаць кожны падлетак («Хмара» па форме і драматургіі — юнацкі раман, але па сур'ёзнасці закранутай тэмы — супердарослы). Магчыма, калі ў юнацтве хлопец ці дзяўчына прачытаюць гэты раман і ў будучыні стануць вялікімі начальнікамі, то ўспаміны ад прачытання «Хмары» дапамогуць ім не быць такімі раўнадушнымі і непаслядоўнымі ў дзеяннях, якімі былі начальнікі ў часы чарнобыльскай катастрофы і катастрофы, апісанай у кнізе Гудрун Паўзэванг.

Дарэчы, у 2006 годзе паводле рамана «Хмара» зняты аднайменны фільм. Праўда, рэжысёр Грэгар Шнітцлер крыху змяніў фабулу — зрабіў больш прамалінейнай і меладраматычнай, увёў любоўную лінію пра каханне падлеткаў, трохі старэйшых за герояў кнігі.

Сюжэт кнігі насамрэч быццам бы спісаны з рэальных падзей у Чарнобылі. «Усё па-ранейшаму, толькі імёны змяніліся», — як напісаў адзін паэт. Дзеянне адбываецца калісьці ў 1990-х гг. Пра Чарнобыль ужо амаль забыліся... Але раптам адбываецца пашкоджанне рэактара ў Графэнрайнфэльдзе, недалёка ад Швайнфурта. У ФРГ суперкатастрофа. Улады супакойваюць, аднак у насельніцтва ўзнікае паніка, і яно імкнецца ўцячы з Графэнрайнфэльда. На дарогах пануе вайна. Пасярод гэтай вайны за выжыванне — Яна-Бэрта, 14 год, і яе маленькі брат Улі, 7 год, са Шліца пад Фульдай. Іх бацькі паехалі на тры дні з дому: бацька на пасяджэнне ў Швайнфурт, маці — з ім. Дзеці спрабуюць уцячы...

Уладзімір Папковіч узяўся за пераклад «Хмары» нездарма. Сам лёс указаў яму на гэты раман:

— У 1989 г. я ўпершыню з вялікай афіцыйнай групай «барацьбітоў за мір» трапіў у Заходнюю Германію, дзе 10 дзён жыў у адной сям'і. На развітанне мае знаёмыя падаравалі гэтую кніжку. Тады, пасля Чарнобыля, вельмі актуальную. У тым жа самым годзе ў Віцебскім педагагічным інстытуце імя Кірава (цяпер універсітэт імя Машэрава) была ўведзена спецыяльнасць «нямецкая мова». Мы пачалі рыхтаваць настаўнікаў замежных моў. Я атрымаў першую групу «немцаў». Прачытаўшы «Хмару», вырашыў, што нядрэнна было б чытаць кніжку са студэнтамі. І мае сябры з Германіі купілі нам патрэбную колькасць экзэмпляраў. Мова — простая, змест — актуальны. Калі я выйшаў на пенсію, я ўзяў ды пераклаў кніжку на родную мову.

Шчыра, я плакала, чытаючы. Як плакала, чытаючы цалкам дакументальную «Чарнобыльскую малітву» Святланы Алексіевіч... Што для чалавека можа быць страшней за жудасную нябачную навалу, здольную ў адно імгненне разбурыць абсалютна ўсё: тваё жыццё, жыццё ўсіх тваіх блізкіх і нават жыццё тваіх нашчадкаў?.. Хмара пакідае чалавека без будучыні. Нават вайна — не настолькі страшная з'ява ў параўнанні з неўтаймоўнай радыеактыўнай хмарай. Некіруемай. Бязлітаснай. Усё-ткі заўжды ёсць спадзеў, што тыя, хто развязалі вайну, паміраюць, паразумеюцца. Бо мы ж усе людзі... А вось перад хмарай, якой кіруе толькі вецер, усе роўныя...



Усе факты, якія былі на той момант вядомыя пра радыяцыю і асаблівасці аварыі на ўкраінскай атамнай электрастанцыі, гучаць у кнізе. Меры засцярогі ад радыяцыі, ахвяры, прыкметы праявы апраменьвання, распаўсюджванне заразы, яе ўсюдыіснасць і ўсюдыпранікненне, шок і азвярэнне людзей. І самае галоўнае, што маштабы забруджвання радыяцыяй залежаць не толькі ад магутнасці станцыі і маштабаў самой аварыі, але і ад кірунку і сілы ветру — фактараў, якія чалавек яшчэ не навучыўся кантраляваць. Пасля сёлетняй аварыі на Фукусіме да кнігі звярнулася вельмі шмат чытачоў. Людзі, усведамляючы сваю бездапаможнасць перад «непрыкметнай» радыяцыяй, шукаюць у мастацтве, у літаратуры падтрымку... І калі захочуць — яны знойдуць. Галоўнае, што можна зразумець з кнігі Гудрун Паўзэванг, — нам неабходна вучыцца на сваіх памылках. У свеце была Хірасіма, быў Чарнобыль, ёсць Фукусіма...

Тым часам у Германіі, дзе налічваецца 17 ядзерных рэактараў, 30 мая абвясцілі пра сваё канчатковае рашэнне заглушыць усе да 2022 года. Праца на сямі рэактарах ужо была часова спынена ў сакавіку адразу пасля трагедыі на АЭС «Фукусіма -1».

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

## КАМЕНТАРЫЙ СПЕЦЫЯЛІСТА

**Валянціна БРЫЛЁВА, навуковы супрацоўнік ДНУ «Аб'яднаны інстытут энергетычных і ядзерных даследаванняў — Сосны» НАН Беларусі па просьбе «Звязды» распавяла пра бяспечнасць выкарыстання атамных электрастанцый сёння; пра асаблівасці забеспячэння бяспекі на АЭС-2006, якую плануюць будаваць у Беларусі і пра тое, чаму Германія вырашыла спыніць працу на сваіх ядзерных рэактарах.**

Кожная краіна выбірае сваю энергетычную палітыку. Гэта тлумачыцца і эканамічнымі, і палітычнымі прычынамі, і геаграфічным месцазнаходжаннем, — тлумачыць Валянціна Аляксандраўна. — Вось, напрыклад, у Нарвегіі 90% гідраэнергіі за кошт таго, што ў іх шмат гідрарэсурсаў. І ў іх няма праблем. А ў Беларусі 95% энергетычнага балансу складае пакупны газ. Наогул, самае аптымальнае, з пункту гледжання энергетычнай бяспекі, каб было некалькі відаў энергарэсурсаў. Таму ў нас распрацавана канцэпцыя энергетычнай бяспекі, дзе прадугледжана выкарыстанне розных відаў энергіі. У тым ліку будаўніцтва атамнай электрастанцыі. Разам з тым у краіне ажыццяўляецца праграма выкарыстання мясцовых відаў паліва (гідраэнергія, торф, драўніна і інш.), развіваюцца ўзнаўляльныя крыніцы энергіі (сонца, вецер). Але пакуль яны занадта дарагія і патрабуюць рэзервавання. Атамныя станцыі зараз разглядаюцца практычнай большасцю дзяржаў як сучасныя крыніцы энергіі, якія дазваляюць мець збалансаваную электраэнергетыку.

***— Наколькі бяспечна выкарыстанне атамных электрастанцый сёння?***

— Бяспекі шмат не бывае. Гэтым прынцыпам кіруецца і Расія — стратэгічны партнёр Беларусі ў будаўніцтве АЭС. Пасля Фукусімы практычна ўсе краіны пераглядаюць сваю атамную палітыку. У асноўным ідуць па кірунку ўзмацненняў патрабаванняў бяспекі да сваіх атамных станцый і рэвізіі іх працы, праводзяць так званыя стрэс-тэсты. І Расія таксама. Там зараз трохступеньчатая праграма развіцця атамнай энергетыкі: праверка існуючых станцый, вывад з эксплуатацыі старых станцый з заменай на новыя; замыканне паліўнага цыклу і развіццё рэактараў на хуткіх нейтронах. Але апошняе на далёкую перспектыву, пачынаючы з 2030-х гг. Расійскія спецыялісты правялі такое мадэляванне: налажылі ўмовы рэактараў Фукусімы-1 на сучасную АЭС-2006, якая прапаноўваецца для будаўніцтва ў Беларусі. Навукоўцы прыйшлі да высновы, што ніякіх істотных змен па бяспечнасці гэтай станцыі не трэба рабіць, таму што практычна па ўсіх паказчыках аварыя кшталту японскай на АЭС-2006 адбыцца не можа. Наша станцыя будзе практычна копіяй Балтыйскай АЭС, якую плануецца пабудаваць у Расіі, у Калінінградскай вобласці. У адрозненне ад Фукусімы наша станцыя будзе двухконтурная, што павышае ўзровень бяспекі, акрамя таго, там няма пары ў актыўнай зоне.

***— А вось Германія плануе цалкам перабудоўваць сваю энергетычную палітыку, адмовіўшыся ад атамных станцый да 2022 года. Як вы можаце пракаментаваць гэтае рашэнне?***

— Па-першае, у Германіі моцнае вугальнае лобі. А па-другое, энергетычная палітыка і, у прыватнасці, развіццё атамнай энергетыкі часта тлумачыцца палітычнай абстаноўкай у краіне. Зараз Германія напярэдадні выбараў. Таму часткова гэтае рашэнне тлумачыцца і палітычнымі працэсамі. Памятаеце, раней, калі Норберт Ротген, прыйшоў ва ўладу, ён адмовіўся ад АЭС, потым Меркель прыйшла — вярнула. У Германіі каля 40% доля атамнай энергетыкі. Гэта досыць высокі працэнт. Калі адмовіцца ад усіх рэактараў, застанецца адкрытым пытанне, чым іх замяніць. Калі павялічыць долю вугальнай энергетыкі, гэта вельмі сур'ёзна падарве экалогію...

***— Усё-такі трагедыя ў Фукусіме скаланула свет... Часткова, рашэнне Германіі адмовіцца ад АЭС выклікана і гэтай падзеяй. Тым больш што ў Нямеччыне грамадства заўжды вельмі актыўна выказвалася супраць ядзернай энергетыкі.***

— Так. Але зараз толькі Швейцарыя, Германія і Італія афіцыйна заявілі пра адмову ад АЭС. Дзве іншыя краіны яшчэ вагаюцца. А амаль сорак краін, якія раней заяўлялі пра развіццё атамнай энергетыкі, ад яе не плануюць адмаўляцца.

Для Беларусі асноўным момантам з'яўляецца тое, што размяшчэнне станцыі ў сейсманебяспечнай зоне нам не пагражае. Да таго ж станцыя АЭС-2006 разлічана на 8 балаў па шкале MSK-64. А ў Беларусі самы моцны землятрус адбыўся 8 снежня 1908 года, ён дасягнула 7 балаў па 12-бальнай шкале MSK-64, а магнітуда была ўсяго каля 4. Цунамі нам таксама не пагражае. У нас іншыя кліматычныя і геаграфічныя ўмовы. Японцы проста не прадугледзелі вышыню цунамі. Дамба была разлічана на 6,5 м, а хваля цунамі паднялася да 15 м. І там менавіта цунамі стала прычынай катастрофы: былі залітыя аварыйныя дызель-генератары. Гэта практычна не звязана з бяспекай, а звязана з прыроднымі катаклізмамі, на якія не была разлічана станцыя. Таму казаць пра тое, што ў Беларусі таксама можа такое адбыцца, не выпадае. Вядома, могуць быць іншыя сцэнарыі развіцця аварый. Але па тым, які сёння плануецца ўзровень бяспекі, аварыі амаль немагчымыя.

### Пасляслоўе аўтара

Зразумела, што ўзровень бяспекі пасля кожнай аварыі на якой-кольвек АЭС павялічваецца. Тэхналогіі не стаяць на месцы, і навукоўцы робяць усё магчымае для таго, каб зрабіць ядзерныя рэактары больш бяспечнымі. Вось пра катастрофу ў Фукусіме гавораць, што яе прычынай паслужыла цунамі. Таму што дамбы, якія абаранялі рэактары ад прыродных навалаў, аказаліся ніжэйшымі за вышыню цунамі. Чаму? Таму што станцыя будавалася ў 1960-х гг. мінулага стагоддзя, навукоўцы нечага не пралічылі. І зараз, маўляў, такіх рэактараў ужо не будуюць і г. д. і да т. п. Але хто можа гарантаваць, што навукоўцы пралічаць усе дробязі наперад на ўвесь тэрмін эксплуатацыі АЭС?! Жыццё — такая непрадказальная рэч. Заўжды можа здарыцца ўсё што заўгодна. І найвышэйшым узроўнем бяспекі заўжды будзе той, які цалкам абяззбройвае любыя патэнцыйна шкодныя аб'екты. Плюс да таго, якой бы аўтаматызаванай ні была праца рэактара, ніколі нельга выключаць чалавечага фактару: халатнасці, непрафесійнасці. Якія, дарэчы, і сталі галоўнай прычынай чарнобыльскай катастрофы. А ў падсвядомасці простых людзей трагічныя выпадкі адбіваюцца надоўга. Напрыклад, паводле галасавання ў рамках ток-шоу «Выбар» (18 мая 2010 года) айчыннага тэлеканала АНТ каля 87% беларусаў не вераць у бяспечнасць сучасных АЭС.

Кніга Гудрун Паўзэванг «Хмара» — гуманістычны твор. Таму што на першае месца ставіць каштоўнасць і непаўторнасць чалавечага жыцця. І тое, што раман з'явіўся ў перакладзе на беларускую мову, не толькі фармальна ўзбагачае сучасную айчынную літаратуру, але і дае дадатковы штуршок для духоўнага росту тых, хто здолее гэты раман прачытаць.

## ВІШНЯ

Свет і сусвет. Чалавека

**Вішня ў народнай творчасці ўсходніх славян заўсёды сімвалізавала прыгажосць дзяўчыны або жанчыну, жаночы лёс, цнатлівасць, юнацкае каханне. У хрысціянстве вішня стала сімвалам дабрыні, добрых пачынанняў і спраў, часам на абразах Ісус Хрыстос трымае ў руках галінкі ці ягады вішні.**

● На дзявяты дзень пасля нараджэння дзіцяці, перад тым, як пайсці з хаты парадзіхі, бабка-павітуха выконвала абрад першага рытуальнага купання. Ваду, у якой купалі дзяўчынку, абавязкова вылівалі пад вішню, каб малая стала такой жа стройнай і прыгожай, абавязкова выйшла замуж.

● Часцей за ўсё менавіта галінкі вішні дзяўчаты выкарыстоўвалі ў варожбах. На Беларусі, ва Украіне і Расіі вядомы звычай адразаць галінкі вішні (чарэшні) у дні святых Андрэя, Кацярыны, Варвары і ставіць іх у вільготны пясок ці суглінак. Калі яны пачыналі квітнець напярэдадні Раства Хрыстовага ці Новага года, гэта прадказвала дзяўчыне хуткае вяселле, а іншым дамачадцам шчаслівы, удалы, ураджайны год. Калі ж галінкі не ажывалі, гэта было дрэнным знакам. Аднак у некаторых рэгіёнах такія дзеянні лічыліся вялікім грахом, таму што нельга было прымушаць дрэўца цвісці насуперак прыродзе.

● Калі вішня ў садзе цвіла двойчы на год — вясной і ўвосень — гэта прадказвала смерць кагосьці са сваякоў. Было заўважана, што тое дрэва, якое будзе квітнець двойчы на год, высахне.

● У народнай медыцыне вішня — скарбніца вітамінаў, сок вішнёвых ягад выкарыстоўвалі ад жаўтухі, як супакаяльны сродак, адвар сушаных ягад — пры захворваннях страўніка, ад малакроўя і цяжкага пахмелля, лісце вішні ў якасці кампрэса выкарыстоўвалі ад галаўнога болю.

● Па стане лісця на вішні меркавалі пра будучую зіму: пакуль лісце на дрэве, колькі б снегу ні было — усё роўна растане.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Лідскі будаўніча-мантажны трэст № 19



Генеральны дырэктар БМТ-19 Віктар КАШКІДЗЬКА.

# Не тактыка выжывання, а стратэгія развіцця

**Лідскі будаўніча-мантажны трэст № 19 называюць у Лідзе галоўнай будаўнічай арганізацыяй горада. І далёка не выпадкова. Трэст пачынае сваю біяграфію з 1966 года (уважлівы чытач не можа не заўважыць: сёлета тут адзначаюць 55-годдзе). А на 60-70-я гады мінулага стагоддзя ў Лідзе якраз прыпадаў час інтэнсіўнага будаўніцтва, узвядзення буйнамаштабных аб'ектаў. Прыгадаем іх: гэта заводы «Лакафарба» і «Оптык», абутковая фабрыка, камбінат хлебапрадуктаў, «Лідсельмаш»; гэта многія іншыя аб'екты, у тым ліку адміністрацыйнага, медыцынскага і гандлёвага прызначэння. Гэта таксама аб'екты ў Бярозаўцы (тут у першую чаргу варта назваць шклозавод «Нёман»), Мастах, Скідалі, Іўі, Смаргоні. У паслуговым спісе трэста ўжо больш позняга, цяперашняга, часу — узвядзенне аб'ектаў магістральнага газаправода «Ямал-Еўропа», удзел у рэканструкцыі Нясвіжскага замка... На трэст, як на галоўную будаўнічую арганізацыю горада, летась быў ускладзены асноўны цяжар па падрыхтоўцы Ліды да рэспубліканскіх «Дажынак». І можна тут смела зазначыць: з гэтай пачэснай задачай у трэсце справіліся на «выдатна». Варта паглядзець на тыя аб'екты, якія ён вёў і ўзводзіў.**



Гэтая памятная стэла ў горадзе пабудавана пры ўдзеле будаўнікоў БМТ-19.



Лядовы палац — адзін з самых прыгожых будынкаў Ліды.



Вопытныя муляры Іван ГЕБЕНЬ і Міхаіл МАЙСЕВІЧ удзельнічаюць у рэстаўрацыі і рэканструкцыі Лідскага замка.

Асобныя з іх мы наведалі. І ў прыватнасці, Лядовы палац. Тут жа зазначым: наконт паўсюднага ўзвядзення такіх палацаў існуюць розныя думкі. І можна адназначна меркаваць, — не ўсюды яны патрэбны. Аднак, як бы там ні было, Лідскі палац можна смела лічыць архітэктурным шэдэўрам, нават свайго роду візітоўкай горада, вельмі ж арыгінальным і прыгожым ён атрымаўся. Як зазначаў дырэктар гэтага ўнікальнага збудавання Мар'ян Шот, Палац-цуд. А яшчэ Мар'ян Часлававіч паведаміў: агульная плошча гэтага збудавання — 8680 квадратных метраў, аб'ём — 69129 кубічных метраў, яго трыбуны разлічаны на тысячу гледачоў. Пад галоўнай пляцоўкай палаца (памерамі 61х30 метраў) пракладзены 22 кіламетры труб, якія і ствараюць мінусавую тэмпературу, ды яшчэ 22 кіламетры (для папярэдняга падагрэву, «каб не было ўспучвання») замураваныя ніжэй, у бетоне. Акрамя галоўнай лёдавай пляцоўкі, якую, дарэчы, нескладана пераўтварыць у канцэртную пляцоўку, у палацы таксама ёсць вялізная більярдная (каля дзясятка сталоў), добра аснашчаныя трэнажорны і фітнэс-залы, іншыя памяшканні рознага прызначэння. Вельмі прыгожа добраўпарадкавана і навакольная тэрыторыя — з лаўкамі, кветнікамі і г.д., якая як месца адпачынку ўжо прыглянулася многім лідчанам. Праўда, дырэктар крыху наракаў на праектантаў гэтай унікальнай канструкцыі, якія не прадугледзелі добрай аховы яе асобных стыкаў ад пранікнення знешняй вільгаці, з чым цяпер вымушаны змагацца работнікі трэста.

Застаецца дадаць, што над гэтым унікальным аб'ектам шчыравалі не толькі працаўнікі Лідскага трэста № 19, але і працаўнікі многіх іншых арганізацый: ААТ «Белсантэхмантаж-2», «Белэлектрамантаж», «Белцеплаізаляцыя» і іншыя.

Калі гэты палац мы яшчэ мусім прадстаўляць менавіта як прэстыжны для Ліды аб'ект, то яе старажытны замак, безумоўна, прадстаўляць не трэба — ён добра знакаміты. А як зразумела ўжо, і на ім адзначыліся будаўнікі трэста № 19. І працягваюць адзначацца. «Поўную рэстаўрацыю і рэканструкцыю замка прадугледжана закончыць у 2014 годзе», — казалі ў трэсце. Адным словам, адпаведнай работы яшчэ шмат. А між тым, наведвальнікі замка ўжо цяпер могуць амаль поўнасцю ўбачыць усе яго знешнія абрысы (зразумела — адноўленыя) і часткова — унутраныя (дваровыя) памяшканні. Тут ужо набылі свой першапачатковы выгляд крапасныя сцены, дзве вежы, унутраная галерэя, якая ўверсе, на ўзроўні байніц, ідзе ўкруг сцяны. Як расказаў прараб Віктар Гулецкі, падначаленыя якога вялі ў замку будаўнічыя работы, на тэрыторыі замка таксама практычна адноўлена казарма, а яшчэ на гэтай тэрыторыі паўстануць кузня, калодзежы, хата старасты і іншыя аб'екты. Дарэчы, як расказалі будаўнікі, такі казус пры гэтым атрымаўся: тут ужо пачалі было ўзводзіць хату старасты, якую праектанты заклалі двухпавярховай, ды прыкінулі: ужо разам з дахам яна закрыла б ад наведвальнікаў супрацьлеглую сцяну. Словам, давялося праектантам «здымаць» адзін паверх. Аднак так і напрошваецца думка, што перад гэтым праектам яны відавочна пашчыравалі над нейчай сучаснай невялічкай (усяго на два паверхі) дачкай для сучаснага ж рыцара, які замест ранейшага даволі нялёгкага мяча мае не менш лёгкі партманет... Але не будзем зайздросціць: галоўнае — мець сапраўдны рыцарскі дух, які якраз і можна будзе адчуць у гэтым замку, дзе шчыруюць цяпер лідскія будаўнікі з трэста № 19.

***

Каля 15 аб'ектаў здалі ў трэсце летась менавіта да «Дажынак», больш за 15 аб'ектаў, якія намечана ўвесці сёлета, узводзяць цяпер. Найбольш важныя з іх — гэта, несумненна, новыя магутнасці на Ваўкавыскім цэментным заводзе, а таксама новы завод па гарачым цынкаванні металічных дэталяў, які ўзводзіцца непасрэдна ў Лідзе. Пра важнасць гэтых аб'ектаў ужо нямала сведчыць тое, што спецыялісты трэста ці не начуюць на іх ды праводзяць там вельмі частыя так званыя штабы з удзелам усіх зацікаўленых у хутчэйшым будаўніцтве асоб, у тым ліку з вобласці і з Мінска. Пра важнасць нарошчвання магутнасцяў па вытворчасці цэменту не варта гаварыць, гэта і так зразумела, а вось пра важнасць другога аб'екта трэба трохі сказаць. І пачнём з таго, што, напрыклад, летась давялося пабываць на адным з мінскіх прадпрыемстваў, на якім скардзіліся: ну вось гэтыя выробленыя дэталі, што будуць працаваць у механізмах пад уздзеяннем знешняга агрэсіўнага асяроддзя, даводзіцца вазіць далёка ў Расію,

**ДЛЯ ДАВЕДКІ.** Лідскі будаўніча-мантажны трэст № 19 уяўляе сабой буйную шматпрофільную арганізацыю, выконвае будаўніцтва як аб'ектаў аховы здароўя, культурна-бытавога прызначэння і жылля, так і прамысловых аб'ектаў. У яго склад уваходзяць: два будаўнічыя ўпраўленні, упраўленне вытворча-тэхнічнай камплектацыі, упраўленне механізацыі і спецыялізаваных работ, спецыялізаванае ўпраўленне аддзелачных работ, жыллёва-эксплуатацыйная кантора. У трэсце выконваюцца ўсе віды будаўніча-мантажных работ, у тым ліку па інжынернай інфраструктуры (за выключэннем цепла- і газазабеспячэння). Працуюць у трэсце 1080 чалавек. Калектыў трэста — неаднаразовы пераможца працоўнага спаборніцтва ў галіне, у вобласці і раёне (пры савецкім часе быў занесены на Ганаровую дошку на ВДНГ СССР). У трэсце дзейнічае сістэма менеджменту якасці ІСО серыі 9001, а таксама сістэма кіравання па ахове працы СТБ 18001. Апошнім часам у трэсце значна абнавілі парк будаўнічых машын і механізмаў, а таксама парк аўтамабільнага транспарту. Толькі за апошнія 3 гады ўсе інвестыцыі ў вытворчасць склалі каля 15 мільярдаў рублёў.

У Лідскім будаўніча-мантажным трэсце № 19 дзейнічае свайго роду правіла: «Мы робім толькі тое, што ўмеем рабіць на «выдатна». А такой, выдатнай, ацэнкі заслугоўваюць практычна ўсе яго аб'екты.



Намеснік генеральнага дырэктара Аляксандр ШЫМУЛЬ.



На ўскраіне Ліды растуць новыя жылыя кварталы, ва ўзвядзенні якіх задзейнічаны будаўнікі будаўніча-мантажнага трэста № 19.



У фармовачным цэху.





Такія прыгожыя лаўкі для саду і хатняга інтэр'еру выраблюць на вытворчай базе БМТ-19. Гэтую прадукцыю дэманструе тэхнік камерцыйнага аддзела Вераніка ВІЛЬБІК.



На будаўнічай пляцоўцы завода па гарачым ацынкаванні металічных дэталяў.

каб менавіта пакрыць іх цынкам і абараніць такім чынам ад уздзеяння таго ж асяроддзя. А гэта немалыя дадатковыя выдаткі. У нас жа ў краіне такой вытворчасці пакуль што няма...

Менавіта вытворчасць для такіх мэт і ўзводзяць цяпер у Лідзе. Яна каштуе немалых грошай: толькі агульнабудаўнічыя работы, якія выконваюць розныя падраздзяленні трэста № 19, пацягнуць на суму каля 50 мільярдаў рублёў. Але гэты аб'ект, які, дарэчы, курыруе Акадэмія навук, яшчэ раз варта падкрэсліць, вельмі актуальны для краіны. З тым, каб справіцца з яго ўзвядзеннем у вызначаны і даволі сціслы тэрмін, трэст накіраваў сюды вялікія сілы. Дарэчы, канцэнтрацыя сіл, механізмаў і рэсурсаў менавіта на ўводных аб'ектах стала тут звычайнай практыкай, і яна прыносіць свой добры плён.

***

Добра прыбралася, прыхарашылася Ліда ў сувязі з леташнімі «Дажынкамі». З'явіліся ў ёй новыя, прыгожа высланыя сучаснай брусчаткай плошчы, ззяюць рознакаляровымі фарбамі адрэстаўраваныя пабудовы; на ўездзе з Гродна на шырокай плошчы паўстала прыгожая, узнесеная ўвысь стэла з выявамі чатырох апосталаў-евангелістаў і, крыху ніжэй, вытрымкамі з іх свяшчэнных пісанняў... Прыгожы, чысты горад, які многія з задавальненнем наведваюць, пра што, у прыватнасці, няблага сведчыць амаль заўсёды шумлівы аўтавакзал...

Працягвае Ліда харашэць цяпер, і гэтую новую прыгажосць, зразумела, ствараюць рукі лідскіх будаўнікоў.

Маляўніча глядзіцца з боку аб'язной шашы мясцовасць у раёне лідскай гарадской вуліцы Гастэла — крыху ўзгорыстая, з невялікімі перападамі мясцовасці. Словам, прырода як быццам сама прапанавала неаднастайны ландшафт: выкарыстоўвайце. І будаўнікі выкарыстоўваюць гэты ландшафт спаўна: хвалямі разбегліся па гэтых невялічкіх пагорках шматпавярховыя жылыя дамы...

Раён вуліцы Гастэла забудоўваюць некалькі будаўнічых арганізацый горада, разам з імі, як зразумела ўжо, узводзяць свае дамы і працаўнікі трэста № 19. Словам, атрымліваецца гэткае негалоснае спаборніцтва: хто лепш?

У будаўнікоў трэста № 19 у гэтым раёне некалькі жылых дамоў; два з іх маюць ужо амаль закончаны выгляд, адзін толькі пачаў узводзіцца. Каля ўзведзеных дамоў — ужо цалкам добраўпарадкаваная тэрыторыя, з прасторнымі плошчамі для газонаў і пляцоўкамі для транспарту, з ужо адразу абсталяванай дзіцячай пляцоўкай; у саміх дамах вока заўважае шклопластыкавыя пакеты.

— Ну, такія вокны — гэта ўжо звычайная амуніцыя для сучасных дамоў, — зазначае намеснік генеральнага дырэктара па будаўніцтве і вытворчасці трэста № 19 Аляксандр Шымуль, якога мы знайшлі тут жа, на будаўнічай пляцоўцы. — А вось што найбольш адметнае ў нашых цяперашніх дамах — дык гэта іх выдатная тэрматрываласць (удакладнім: яна ўтвараецца за кошт шматслаістых сцен з цэглы, сілікатных блокаў і праслойкі паміж імі з пенапласту), а таксама тое, што кватэры ў нашых цяперашніх дамах маюць індывідуальнае ацяпленне. І гэта абсалютна па кожнай кватэры..

Як расказаў Аляксандр Шымуль, гарачая вада, якая падаецца з цеплапункта ў дом, ужо на паверхах размяркоўваецца па кватэрах; адпаведна — вядзецца індывідуальны ўлік выкарыстанага цяпла, прычым кожны можа адкарэктаваць колькасць прыходзячага да яго цепланосьбіта, а значыць, і тэмпературу, «пад сябе». А яшчэ на вуліцы знаходзіцца датчык, які, у залежнасці ад надвор'я і знешняй тэмпературы, таксама карэктуе яе, папярэдне. Уся гэтая сістэма, паводле слоў намесніка генеральнага дырэктара, атрымала назву «разумны дом». І такія, «разумныя», дамы будаўнікі трэста пачалі ўводзіць яшчэ летась.

Аб'ёмы жылля, якое ўзводзіцца, займаюць у агульных аб'ёмах трэста даволі важкую долю. Так, калі летась усіх выкананых у ім работ выйшла на суму 48 489 мільёнаў рублёў, то жыллё заняло ў гэтых аб'ёмах больш за 25 мільярдаў (па генеральным падрадзе). Прычым леташні год у гэтым плане лічыцца не зусім характэрным — у сувязі з падрыхтоўкай горада да «Дажынак», калі ўвага была больш звернута на іншыя аб'екты. А ўвогуле, паводле слоў генеральнага дырэктара трэста № 19 Віктара Кашкідзькі, за апошнія два гады (пераддажынкавыя) увод жылля, узведзенага трэстам, павялічыўся больш чым у 3 разы.

Сёння будаўнікі трэста шчыруюць і на іншых аб'ектах — узводзяць малочнатаварную ферму ў адным з СВК раёна, будуюць жыллё для работнікаў шклозавода ў Бярозаўцы, робяць тут рэканструкцыю самога завода...

«Нягледзячы ні на што, працы і заказаў хапае, — падкрэсліваюць у трэсце, маючы на ўвазе сёлетнія меркаванні наконт магчымага скарачэння бюджэтнага будаўніцтва. — Вось толькі будаўнічыя матэрыялы ў цане вельмі падскочылі, што не зусім добра для будаўнікоў»...

***

Вядома, гэта не зусім добра для ўсіх будаўнікоў, без выключэння. Але і ў гэтых умовах у калектыву трэста № 19 ёсць свайго роду кампенсацыйная падушка — гэта яго вялізная вытворчая база, на якой выраблюцца амаль усе камплектуючыя жалезабетонныя вырабы і элементы, растворы для аб'ектаў, якія ўзводзяцца, а таксама неабходныя піламатэрыялы і сталярныя вырабы... Упраўленне вытворча-тэхнічнай камплектацыі (УВТК) — так называецца адно з асноўных падраздзяленняў трэста, якое і гаспадарыць на ўказанай вытворчай базе.

Па сутнасці, гэтая база ўяўляе сабой немалы па памерах завод. Уявім сабе вытворчае памяшканне (пад адным дахам), якое выцягнулася ў даўжыню метраў пад 250 ды ў шырыню метраў на 100. У ім размясціліся асноўныя цэхі УВТК — фармовачны і арматурны. Акрамя таго, на вытворчай базе ёсць раствора-бетонны вузел, шматлікія склады. Тут маюць сваю чыгуначную ветку, дзе выгружаюць цэмент, шчэбень, пясок (дарэчы, у трэста ёсць і свой кар'ер для намывання пяску) і іншыя матэрыялы. Тэрыторыя, якую займае УВТК, складае 16 гектараў, і ў выпадку чаго тут, так бы мовіць, яшчэ ёсць дзе разгарнуцца; гадавы аб'ём вытворчасці — каля 12 мільярдаў рублёў. Асноўная наменклатура — пустотныя пліты перакрыццяў, лесвічныя пляцоўкі, бетонныя кольцы, перамычкі, элементы шахт ліфтаў і іншыя вырабы; са сталярнага цэха на аб'екты трэста паступаюць плінтус, брус, налічнік, дошка падлогі. Літаральна месяц таму ва УВТК увялі ў эксплуатацыю лінію па вырабе ўласнага пенапалістыролу — для мэт укладвання яго ў сцены дамоў у якасці той жа тэрмаізаляцыйнай пракладкі. І яшчэ ва УВТК пазнаёмілі з наступным аб'ектам: некалькі гадоў таму тут паставілі эканамічную модульную кацельню магутнасцю каля 3 мегават (яе асноўная мэта — выпрацоўка пары для прапарвання жалезабетонных вырабаў), а ў выніку сталі эканоміць да 60 мільёнаў рублёў за год. А ў перспектыве — свае вокны ПВХ.

А яшчэ старшы эканаміст УВТК Яўген Турко паведаміў: сёлета калектыў упраўлення адзначыў свой асобны юбілей — 40-годдзе.

***

У народзе кажуць: запас бяды не робіць. І паступаюць адпаведна. Калектыў Лідскага трэста № 19, па сутнасці, таксама кіруецца гэтай мудрасцю. Вышэй ужо было сказана: тут маюць цяпер неблагія заказы, і іх хопіць на ўвесь год. А разам з тым, у трэсце трымаюць на прыцэле і расійскі рынак. На ўсякі выпадак. Тым больш, што на тым жа расійскім рынку калектыву трэста давялося працаваць некалі раней. Напрыклад, на яго будаўнічым рахунку санаторый у Калінінградскай вобласці.

Такім чынам, пра запас. У Расіі, у сувязі з адменай ліцэнзавання будаўнічых работ (яго не так даўно адмянілі і ў Беларусі) створана так званая самарэгулюемая арганізацыя будаўнікоў (буйное міжрэгіянальнае аб'яднанне), быць членам якой — значыць мець права на будаўніцтва на расійскай тэрыторыі; прычым у адпаведным пасведчанні, што выдаецца, указваюцца ўсе віды работ, якія можа выконваць член гэтай арганізацыі. Словам, тое ж пасведчанне, па сутнасці, замяніла ранейшую ліцэнзію. Аднак гэта свайго роду дэталі. А галоўнае — калектыў лідскага трэста яшчэ раней атрымаў такое пасведчанне, а не так даўно пацвердзіў адпаведнае членства. І тут ужо трэба казаць не проста пра нейкі запас, а пра пэўную дальнабачнасць калектыву. Дальнабачнасць, якая вынікае з яго наступнай пазіцыі, што пакладзена ім у аснову яго дзейнасці: не тактыка выжывання, а стратэгія развіцця. Такім чынам мяркуюць тут пра сваю перспектыву.

Выдатная пазіцыя.

***

А на заключэнне невялікае інтэрв'ю з генеральным дырэктарам Лідскага будаўніча-мантажнага трэста № 19 Віктарам Кашкідзькам.

**— Віктар Паўлавіч, ваш трэст добра працуе, штогод мае значны прырост аб'ёмаў. Што вы ставіце ў аснову сваёй працы?**

— У першую чаргу — хуткасць, надзейнасць, якасць. Хуткасць, своечасовы ўвод аб'ектаў напрамую звязаны з агульным коштам будаўніцтва, усякае зацягванне якога, вядома ж, вядзе да яго падаражання. Мы ўсё робім для таго, каб строга захоўваць тэрміны будаўніцтва, каб здаваць свае аб'екты своечасова.

Ну, а якасць будаўніцтва — гэта сёння, увогуле, найгалоўны аргумент у канкурэнтнай барацьбе сярод будаўнікоў; адпаведная, павышаная ўвага пытанням якасці надаецца і ў нас. Якаснай працы нашых будаўнічых падраздзяленняў у многім садзейнічае іх цесная сувязь і ўзаемадзеянне з праектантамі аб'ектаў. Так, падчас узвядзення аб'ектаў іх, як правіла, раз на тыдзень наведваюць галоўныя інжынеры праектаў або іншыя прадстаўнікі гэтай службы. Падраздзяленні трэста працуюць у поўнай адпаведнасці з патрабаваннямі сістэмы менеджменту якасці ІСО 9001. Зразумела, у трэста маецца адпаведная сертыфікацыя.

**— У вас ідуць значныя адлічэнні на сацыяльныя патрэбы калектыву. Развіццё сацыяльнай сферы — гэта таксама адзін з вашых прыярытэтных кірункаў?**

— Тут, хутчэй, трэба гаварыць пра захаванне сацыяльнай сферы. Так, на балансе нашага трэста знаходзіцца 5 інтэрнатаў, з іх 4 — сямейнага тыпу. Тут жа варта зазначыць: у трэсце робіцца ўсё для таго, каб нашы работнікі без праблем вырашалі сваё кватэрнае пытанне. Напрыклад, летась здадзены 40-кватэрны дом, які, вядома, быў пабудаваны для нашых работнікаў; сёлета вядзецца рэканструкцыя аднаго з нашых інтэрнатаў пад жылы дом, у якім будзе абсталявана 108 кватэр, якія таксама зоймуць нашы ж работнікі.

**— У вас у «Палітыцы ў галіне якасці» запісана: «Сістэмны аналіз і вывучэнне патрабаванняў і ступені задаволенасці спажыўцоў, заказчыкаў». Пракаментуйце, калі ласка, гэты пункт.**

— Заказчык — гэта наш работадаўца, і максімальнае задавальненне ўсіх яго патрабаванняў і пажаданняў, яго давер таксама ляжыць у аснове нашай працы. На рахунку трэста шмат узведзеных аб'ектаў, і ўсе яны паспяхова, без нараканняў заказчыкаў эксплуатуюцца. А гэта значыць, што выкананы гэтыя аб'екты на добрым прафесійным узроўні. Трэст пастаянна пашырае кола сваіх заказчыкаў; іх колькасць за апошні час значна павялічылася. Безумоўна, гэта сведчыць наконт таго ж даверу іх да калектыву трэста, да прафесіяналізму нашых будаўнікоў, і гэты давер ніяк нельга страціць.

Да слоў генеральнага дырэктара Лідскага будаўніча-мантажнага трэста № 19 варта дадаць: у трэсце ўзяты на ўзбраенне наступны дэвіз — узводзіць аб'екты еўрапейскага ўзроўню якасці «пад ключ».

**Іван БАРАНОЎСКІ.**
**Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).**

УНП 500021255



Зладжана працуе калектыў цэха ўпраўлення вытворча-тэхнічнай камплектацыі, які ўзначальвае Часлаў АРЛАШЫН.

Выпрабавана на сабе

# «ВУНЬ МАЯ НАГА!», АБО АСАБЛІВАСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ МАСОЎКІ-2

**Пакінуўшы сваю анкету ў базе статыстаў «Беларусьфільма», карэспандэнт «Звязды» Ілья ЛАПАТО паўгода чакаў званка са студыі. Што адбывалася далей, у матэрыяле журналіста.**

*Анкету на кінастудыі я запоўніў у канцы студзеня, а патэлефанавалі мне ў пачатку... ліпеня.*

*— Ілья, ці будзе ў вас час з'явіцца заўтра на здымкі?*

*— Так, а што трэба рабіць?*

*— Вы будзеце турыстам. Калі ласка, апраніцеся адпаведна і прыходзьце да гарадской ратушы ў 9:30. За дзень атрымаеце 40 тысяч. Фотаапарат ёсць? Цудоўна, за яго — даплата 10 тысяч. Бывайце!*

*Ні назвы фільма, ні імя рэжысёра. Яшчэ добра, што я здагадаўся ўзяць тэлефон жанчыны Любы, якая павінна будзе заўтра масоўку сустракаць. Я ж не думаў, што тая Люба чакаць нас будзе зусім у іншым месцы і што, акрамя мяне, ніхто са статыстаў нумара яе мабільнага ведаць не будзе...*

### А ты аддаў пашпарт?

...Раніцай наступнага дня, каб не пакінуць уражання ненадзейнага статыста, я прыйшоў да ратушы хвіліна ў хвіліну. І як высветлілася, дарма. Ніякай Любай там і не пахла. Побач са мной — чалавек сем такіх жа хлапцоў і дзяўчат. Дазваніўся да жанчыны я толькі з чацвёртай спробы.

— А дзе вы стаіце?! — пачала з наездаў Любаша.

— Як дзе? Ля ратушы, як нам і сказалі. І нас тут ужо чалавек 15 сабралася...

— А дзе гэтая ратуша? Бо я ля касцёла стаю...

Пазней высветліцца, што стаяла Люба зусім не ля касцёла, а каля царквы, што на плошчы Свабоды. Ратушу жанчына знайшла яшчэ хвілін праз пяць...

— Відаць, яна не тутэйшая, — сышліся мы на думцы з дзяўчынай Машай, якая, як і я, прыйшла да ратушы з фотаапаратам у руках — іграць ролю турыста.



**Люба (справа) забірае пашпарт у дзядулі-статыста. Дакументы нам вернуць толькі пасля таго, як перапішуць пашпартныя звесткі.**

Пабачыўшы людзей ля ратушы, Люба ўпэўненым крокам пайшла да нас. Гэта была сярэдняга росту жанчына з учэпістым позіркам і смуглявай скурай. Красоўкі, байка, джынсы і паходны заплечнік, з якога сіратліва вытыркаўся тэрмас...

Параўняўшыся з намі, жанчына кінула «добры дзень» і папрасіла паказаць фотаапараты. Затым, зляраючы нашы імёны з нейкім спісам у сваім нататніку, Люба папрасіла дастаць пашпарты. Спачатку я думаў, што пашпарт неабходны для праверкі асобы. Але якім было маё здзіўленне, калі акінуўшы вокам мой здымак у пашпарце, Люба рэзкім жэстам бесцырымонна паклала дакумент сабе ў торбу!..

— Гэта каб вы нікуды не сышлі, — суха ўсміхнулася, пабачыўшы маю збянтэжанасць, Люба. Праз хвіліну, калі ў белай торбе вытыркаліся пашпарты ўсіх статыстаў, жанчына некуды зазбіралася. Ідучы ў бок царквы, яна голасна прамовіла: «Буду там...»

Мы ж засталіся стаяць.



**Апошняя падрыхтоўка здымачнай групы. Здымак зроблены тайна — фатаграфаваць акцёраў і здымачную групу было катэгарычна забаронена.**

### «Прыехала ўся камарамі скусаная...»

Бліжэйшыя дзве гадзіны мы проста сядзелі і чакалі. Здымачную групу, акцёраў, рэжысёра... Дакладней, нейкія рухі адбываліся, аднак ніхто нам нічога не казаў. Даведаліся толькі, што здымацца будзем у адной з серый расійскага серыяла «Менты». Адна з галоўных гераінь — Алеся Судзілоўская, а рэжысёр — сам Уладзімір Янкоўскі...

— 40 тысяч — яшчэ добра, — частуючыся маёй цукеркай, дзеліцца вопытам дзяўчына Маша, якая здымаецца ў масоўцы ўжо два гады. — Раней вунь толькі 30 тысяч плацілі, і тое — рускія. Нашы зусім 28 тысяч давалі. Яшчэ добра, як адразу аддадуць. Бывае ж, цэлы месяц чакаеш, а пасля яшчэ ў касе трэба таўчыся — чарга.

Паводле слоў Машы, самымі жорсткімі ў яе «акцёрскай кар'еры» былі здымкі на пляжы, калі з 6 ранку і да 11 вечара трэба было ляжаць на пяску ў купальніку і ствараць імідж бесклапотнай старлеткі. Узгадвае «добрым» словам Маша і Оперны тэатр, дзе на працягу пяці гадзін трэба было ўсміхацца і пляскаць у далоні, пакуль нарэшце героі не станцавалі ўсё так, як было ў сцэнарыі. Запомнілася дзяўчыне і... карупцыя.

— Былі ў нас тут двое — хлопец і дзяўчына, якія адказвалі за масоўку. Дык яны палову нашых грошай сабе ў кішэню клалі. Добра, што іх прагналі. Аднак нядаўна я бачыла іх — працуюць адміністратарамі на адным з тэлеканалаў. Прычым у той жа якасці — статыстаў набіраюць...

Памятае Маша і здымкі ў «амерыканскім начным клубе» — у мінскай «Белай вежы», дзе ў яе нават была «роля» ў эпізодзе: буйным планам у кадры паказалі яе спіну...

— А за цукерку дзякуй, — лагодна ўсміхаецца дзяўчо. — А то я сёння выдала: прыйшла на шпільках і нават бутэрброды не ўзяла. Калі здымкі зацягнуцца да вечара (звычайна так і бывае), то плакаў мой страўнік. Але нічога, не першы раз. Тут не ў лесе, адкуль са здымак я прыехала ўся камарамі скусаная...

**На здымачнай пляцоўцы здзівілі мацюкі. Можа, у рускіх гэта ў норме, але было трохі няёмка. Ну, няхай там сярод здымачнай групы, але чуць такое ад рэжысёра ці ад актрысы, якая, зламаўшы абцас, шчодра мацюкнулася, было дзіўна.**

### Алеся Судзілоўская: «Ах, мая шаўковая кофтачка»

...Нас прывялі на пляцоўку і правялі лікбез: у кадр не глядзець, з акцёрамі не размаўляць, артыстаў і здымачную групу не фатаграфаваць. Трэба было стаяць кучкай каля кабеты-экскурсавода і «ўважліва яе слухаць, фатаграфуючы сабор». Каля нас буйным планам здымалі галоўных акцёраў — Алесю Судзілоўскую і яе калегу па фільме. Сэнс сцэны: мы — экскурсія турыстаў, а Алеся са сваім каханым (як мы зразумелі па сцэнарыі) — нібыта таксама з намі. «Уважліва слухаць экскурсавода» трэба было хвіліны дзве, пасля чаго наш гід прамаўляла словы: «А зараз — ідзём у аўтобус. Нас чакае экскурсія і ў іншыя гарады Расіі» — і мы павінны былі, як гусі, ісці следам.



**Уладальнікі прыпаркаваных паблізу аўто і не даведаюцца, што іх машыны трапілі ў кіно. На здымку рэквізітары здымачнай групы мяняюць беларускія нумары на расійскія, прымацоўваючы іх да аўто гумкамі.**

Пра «і іншыя гарады Расіі» я, як і іншыя статысты, даведаўся ўжо падчас здымак. Мы былі ў шоку. Аказваецца, мы — рускія турысты... Самае цікавае, што нават нумары на прыпаркаваных непадалёк машынах, былі адмыслова заменены на расійскія.

Сцэну, якая ў фільме зойме 15 сек., мы пераздымалі хвілін сорак. Трыццаць пяць хвілін пераздымалі галоўных герояў і пяць хвілін камера пераздымала нас.

— Увага — матор — камера...

— Стоп! Якая камера! Мне прычоску яшчэ не даправілі, — злосна залямантавала актрыса Судзілоўская.

Чакаем яшчэ хвіліну. «Увага—матор—камера...» Рэжысёр загадваў запамінаць, дзе і каля каго мы стаялі, каб пры паўторных здымках мы змаглі паўтарыць усё зноў. Сваю сцэну мы паўтаралі разоў дванаццаць, пакуль не пачаўся дождж.

— Валодзя, у мяне кофтачка з шоўку — я пайшла ў машыну, — паставіла перад фактам рэжысёра актрыса Судзілоўская, накіроўваючыся ў машыну.

У момант «палюбіўшы» галоўную гераіню, статысты стаялі пад дажджом і моклі яшчэ хвілін пяць. Актрыса сядзела ў крэсле, млява папіваючы каву з малаком, і пісала некаму чарговую эсэмэску. Пакуль драбніў дождж, асістэнт Лізачка прыслужліва трымала над галавой актрысы парасон у буйныя гарохі...

### «У прыбіральню я вас не пушчу!»

Здымаліся мы ў перапынках, калі пераставаў дождж. Хоць, у прынцыпе, усё можна было рабіць і хутчэй, рэжысёр чамусьці марудзіў. Прымушаў акцёраў рабіць адно і тое ж па некалькі дубляў.

Здзівілі на здымачнай пляцоўцы мацюкі. Можа, у рускіх гэта ў норме, але было трохі няёмка. Ну, няхай там сярод здымачнай групы, але чуць такое ад рэжысёра ці ад актрысы, якая, зламаўшы абцас, шчодра мацюкнулася, было непрыемна.

**Паводле слоў Машы, самымі жорсткімі ў яе «акцёрскай кар'еры» былі здымкі на пляжы, калі з 6 ранку і да 11 вечара трэба было ляжаць на пяску ў купальніку і ствараць імідж бесклапотнай старлеткі.**

Статысты, якіх агулам было чалавек трыццаць, рэагавалі на ўсё па-рознаму. Моладзь у сваёй большасці за кадрам эмоцый не ўтойвала, а вось пажылыя людзі ўсё рабілі моўчкі — сціпла жавалі батон з каўбасой і чыталі кніжку...

Каб перачакаць дождж, масоўку пагрузілі ў аўтобус. Стрэлка гадзінніка паказвала тры гадзіны дня, а мы здымалі яшчэ толькі другую сцэну. У многіх бурчала ў жываце, але народ стараўся не паказваць, што хоча есці.

— Алё, Віця? Гэта я. Так, здымаемся, — тоненькім галаском шчабятала з мужам шчаслівая жанчынка. Па радасных інтанацыях было заўважна, што жанчына задаволеная і сабой, і дачкой, якая сядзела побач. — Дзе? Эээ...Мастацкі фільм, ага, — жанчына нават не ведала, што здымаецца ў крымінальным серыяле. — Што? Так, мы ўжо за тыдзень трэці раз здымаемся...

Седзячы ў душным аўтобусе ўжо паўгадзіны, мы з Машай вырашылі выйсці праветрыцца.

— Гэй, маладыя людзі, куды гэта вы? Я вас не адпускала, — спыніла нас Люба, ледзьве мы выйшлі з аўтобуса. — У прыбіральню? У прыбіральню я вас пакуль не пушчу. Чакайце, пайду даведаюся, ці можна.

**...Пакуль Люба ішла да машын са здымачнай групай, у рацыі аднаго з асістэнтаў мы пачулі: «Так, акцёры ідуць на абед. Хвілін 10-15, магчыма, даўжэй. Масоўцы скажы, што ДЗЕСЯЦЬ хвілін...»**

**Ілья ЛАПАТО. Фота аўтара.**

## «Хачу здаваць кватэру. Дорага. Як потым плаціць падаходны падатак?»

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

**У рэдакцыю з пытаннем патэлефанаваў мінчанін. Распавёў, што пасля павелічэння сям'і набыў другую па ліку кватэру, куды і пераехаў. Папярэднюю двухпакаёўку як звычайная фізічная асоба хацеў бы здаваць у наём. Зрабіць там дарагі рамонт, заўважыў ён, і браць адпаведную вялікую плату. Наколькі вялікую, суразмоўца не стаў удакладняць. Затое папрасіў дапамагчы знайсці адказ на пытанне: якім чынам — па якіх стаўках ці фіксаваных сумах — ён павінен будзе плаціць падаходны падатак за здачу жылля іншым фізічным асобам?**

Каб дапамагчы чалавеку, рэдакцыя мусіла звярнуцца па дапамогу ў інспекцыю Міністэрства па падатках і зборах па г. Мінску. Вось што там нам паведамілі.

Падаткаабкладанне даходаў, атрыманых фізічнай асобай ад іншай фізічнай асобы, што не з'яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам, ад здачы ў арэнду (субарэнду), наём (паднаём) жылых памяшканняў, рэгулюецца Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 4 жніўня 2006 года № 497 «Аб аплаце падаходнага падатку ў фіксаваных сумах», са змяненнямі і дапаўненнямі (далей — Указ).

Згодна з падпунктам 1.1 пункта 1 Указа, даходы фізічных асоб, што не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, атрыманыя ад здачы іншым фізічным асобам у арэнду (субарэнду), наём (паднаём) жылых і (ці) нежылых памяшканняў, якія знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, у памеры, што не перавышае 500 базавых велічынь у падатковым перыядзе, вызначаных на дату фактычнага атрымання даходу, абкладаюцца падаходным падаткам у фіксаваных сумах, межы якіх вызначаны Указам, а канкрэтны памер у пэўным населеным пункце ўстанаўліваецца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі ўлады.

Так, памер фіксаваных сум падаходнага падатку з даходаў, атрыманых фізічнымі асобамі, што не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, ад здачы іншым фізічным асобам у наём жылых памяшканняў, размешчаных у горадзе Мінску, вызначаны рашэннем Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў ад 25 верасня 2006 года № 259 «Аб вызначэнні памеру фіксаваных сум падаходнага падатку з даходаў, атрыманых ад здачы ў арэнду (субарэнду), наём (паднаём) жылых і нежылых памяшканняў» у залежнасці ад размяшчэння жылога памяшкання ў канкрэтнай эканоміка-планіровачнай зоне.

За кожны здадзены пакой, згодна з вышэйназваным рашэннем, вызначаны наступныя фіксаваныя сумы падаходнага падатку у базавых велічынях у месяц (зараз адна базавая велічыня складае 35 000 рублёў): першая эканоміка-планіровачная зона — 2; другая эканоміка-планіровачная зона — 1,5; трэцяя, чацвёртая, пятая эканоміка-планіровачныя зоны — 1.

Да пачатку атрымання даходаў ад здачы жылля ў наём жылога памяшкання іншай фізічнай асобе фізічная асоба павінна заключыць дагавор найму (паднайму) жылога памяшкання. Пасля заключэння дагавору найму (паднайму) жылога памяшкання фізічная асоба, якая здае гэтае памяшканне ў наём, абавязаная да вызначанага ў дагаворы найму (паднайму) тэрміну фактычнага прадастаўлення такога памяшкання ў наём (паднаём) зарэгістраваць дагавор у мясцовым выканаўчым і распарадчым органе ці (для дагавораў паднайму жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду) у арганізацыі, якая ажыццяўляе эксплуатацыю жыллёвага фонду.

Фізічныя асобы абавязаны самастойна вылічыць, а таксама своечасова і ў поўным аб'ёме заплаціць у бюджэт падаходны падатак у фіксаваных сумах у памерах, вызначаных абласнымі і Мінскім гарадскім Саветам дэпутатаў, на тэрыторыі якога знаходзяцца жылыя і (ці) нежылыя памяшканні, што здаюцца ў наём, адным з наступных спосабаў на выбар плацельшчыка: або за ўвесь падатковы перыяд (каляндарны год), або за кожны месяц каляндарнага года (памесячна).

Звяртаем увагу, што дзеянне Указа не распаўсюджваецца на выпадкі здачы ў наём (паднаём) жылых памяшканняў па заключаных у каляндарным годзе двух і больш дагаворах, працягласць кожнага з якіх не перавышае 15 дзён.

Пры атрыманні фізічнай асобай у падатковым перыядзе даходаў ад здачы ў наём жылых памяшканняў, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, у памеры больш за 500 базавых велічынь, такія даходы падлягаюць падаткаабкладанню падаходным падаткам па стаўцы 12 працэнтаў па заканчэнні падатковага перыяду (каляндарнага года) на падставе падатковай дэкларацыі (разліку), якія падае фізічная асоба — плацельшчык падаходнага падатку — па месцы яго пастаноўкі на ўлік (месцы жыхарства).

Больш падрабязную інфармацыю фізічная асоба можа атрымаць, звярнуўшыся ў падатковы орган, размешчаны па месцы яго рэгістрацыі або знаходжання памяшкання, якое здаецца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Сузор'е беларусаў свету

# ДЗЯМІДЧЫК Уладзімір Паўлавіч

**(1930, г. Барысаў Мінскай вобл. — 3.9.1977, г. Душанбэ, Таджыкістан) Спецыяліст у галіне арабскай мовы і літаратуры. Доктар філалагічных навук, прафесар. Аўтар некалькіх кніг навуковага характару. Займаўся літаратурнай творчасцю, жывапісам і разьбой па дрэве. Брат акадэміка НАНБ, доктара медыцынскіх навук Яўгена Дзямідчыка.**

Пасля заканчэння Усходняга факультэта Ленінградскага дзяржаўнага ўніверсітэта (1954) па размеркаванні паехаў працаваць у Душанбэ. Выкладчыцкую работу ў Таджыкскім універсітэце ён паспяхова спалучаў з работай у Інстытуце ўсходазнаўства АН Таджыкскай ССР. Як дасведчаны спецыяліст чытаў лекцыі ва ўніверсітэтах Сірыі, Лівана, Егіпта, Ірака, Палесціны, Судана і Іарданіі. Рыхтаваў аспірантаў, дапамагаў у вывучэнні нацыянальных літаратурных помнікаў.

Вучоным апублікавана больш за сотню прац. Бачачы патрэбу ў навучальных дапаможніках, стварыў кнігі «Падручнік арабскай мовы» (Сталінабад, 1958) і «Нарыс сучаснай арабскай літаратуры» (Душанбэ, 1965). Затым выходзіць яго кніжка пра суданскую паэзію XX стагоддзя — адзінае ў той час у СССР даследаванне па суданскай літаратуры. Займаўся рукапісамі арабскіх філосафаў, географаў і падарожнікаў, перакладаў іх тэксты. У 2004 г. у Маскве выйшла кніга У. Дзямідчыка «Свет цудаў у арабскай літаратуры XIII—XIV стст.: Закарый ал-Казвіні і жанр мірабіляў». У ёй упершыню грунтоўна, з выкарыстаннем шырокага матэрыялу разглядаецца творчасць аднаго з самых цікавых сярэдневяковых арабскіх празаікаў — Закарыйа ал-Казвіні, паглыблена даследуецца спадчына арабскай літаратуры. Асабліва выдзяляецца жанр мірабіляў («пра цуды свету»).

У. Дзямідчык добра валодаў беларускай, польскай, рускай, арабскай мовамі, быў добра начытаны ў мусульманскай духоўнай літаратуры, таму мог улавіць тонкасці беларускіх перакладаў Карана, хадзісаў (апавяданняў пра выказванні і дзеянні прарока Мухамада), прынятых малітваў, апавяданняў пра цуды і г.д. На жаль, з велізарнага падрыхтаванага матэрыялу па гэтай тэматыцы наш суайчыннік паспеў апублікаваць толькі адзін артыкул — у зборніку памяці акадэміка І. Крачкоўскага (1987).

Уладзімір Дзямідчык, усебакова адораны чалавек, пісаў вершы і прозу, рабіў мастацкія пераклады. Ім напісана цэлая серыя апавяданняў, звязаных з яго асабістымі партызанскімі ўспамінамі (некалькі твораў пасмяротна, у 1991—1992 гг., надрукаваў часопіс «Памір»). У 12-13 гадоў іх аўтар трапіў у партызанскі атрад, які дыслацыраваўся ў наваколлі Барысава. І таму яго апавяданні эмацыйна адлюстроўваюць жыццё пад нацысцкай акупацыяй у невялікім беларускім горадзе — з расстрэлам закладнікаў, знішчэннем цэлых катэгорый насельніцтва. Партызанскае жыццё паказана не ў хвіліны гераічных змаганняў, а ў доўгія месяцы цяжкай і непрыкметнай працы, бытавой неўладкаванасці, голаду, бесперапыннай небяспекі. У плане выдавецтва «Адзіб» стаяў выпуск зборніка такіх апавяданняў У. Дзямідчыка, падрыхтаваных да друку яго жонкай Ларысай Мікалаеўнай. Крытыкі параўноўвалі гэтыя творы з прозай Васіля Быкава.

У музеях і прыватных зборах Таджыкістана, Беларусі і арабскіх краін засталіся акварэльныя малюнкі У. Дзямідчыка, яго разьба па дрэве. Рукапісы вучонага цяпер знаходзяцца ў Санкт-Пецярбургу, відаць, у прыватных руках.

**Вядучыя рубрыкі Святлана КАРПУЧОК і Яраслаў МАЛЬДЗІС.**

Гэта мы, Госпадзі!

### ПАКАТАЛІСЯ

У дзве гадзіны ночы ў в. Дабрамысь (Івацэвіцкі раён) вучань 9 класа сеў на матацыкл «Іж Планета 4» і паехаў. Неўзабаве ён выехаў на сустрэчную паласу і сутыкнуўся з матацыклам «ММВЗ», якім кіраваў 19-гадовы хлопец. У выніку кіроўца «мінскага» і яго пасажыр апынуліся ў бальніцы.

Дакументаў на кіраванне ў матацыклістаў не было.

### НАХУЛІГАНІЛІ НА МОГІЛКАХ

На могілках г. п. Дамачава (Брэсцкі раён) нехта пашкодзіў 29 пралётаў бетоннага плота. Як высветлілася зрабілі гэта ноччу 18-гадовы мясцовы жыхар і яго аднагодак з Брэста.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

кірмаш
штотыднёвы рэкламны выпуск № 27 (689)
аддзел рэкламы
287 17 79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**ПРАДАЕЦЦА**

❐ А/м «Форд-Эскорт» хэтчбэк, 1994 г.в., 1,4 аб'ём, расход 5,5 л, бензін, добры стан, 2200 у.а.
Тэл. МТС 764 42 91.

❐ А/м «Нісан Прімера» хэтчбэк, 1993 г.в., 1,6, бензін, чырвоны, у добрым стане, 1700 у.а. Торг.
Тэл. МТС 752 01 49.

❐ Катэдж (незавершаны, гатоўнасць 76%), маскоўскі напрамак, пас. Калодзішчы, 14 сотак, вада, газ, ёсць ТУ.
Тэл.: 8 017 208 26 13, 8 029 642 53 22.

❐ Каляска інвалідная прагулачная.
Тэл. 8 044 530 54 74.

❐ Раі пчол.
Тэл. 8 015 977 32 10.

❐ Рухавік, каробка да а/м «Фальксваген-Гольф 2», 1,3Б.
Тэл. МТС 583 77 27.

❐ Драбіна на гумавым ходзе.
Тэл. 8 02133 27 005.

❐ Навясное абсталяванне, прычэп 2ПТС-4, усё для трактара.
Тэл.: 8 016349 83 71, МТС 228 51 75.

**МЯНЯЮ**

❐ Дом каля Баранавічаў, усе выгоды, возера, лес, сад на жыллё ў Мінску.
Тэл. МТС 820 37 43.

**РОЗНАЕ**

❐ Бясплатна падзялюся крэмнем для атрымання крамянёвай вады, якая дапамагае ў лячэнні многіх хвароб. Віцебск.
Тэл. 8 0212 258 079.

ЗВЯЗДА **КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ**

**ЗАПОЎНІЦЕ РАЗБОРЛІВА, ВЫРАЖЦЕ І ВЫШЛІЦЕ НА АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.**

**АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.**

Пашпарт, серыя________ №______________ Выдадзены ______________

Подпіс ____________________ Дата __________

## УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»
## 27 июля 2011 г. проводит повторный открытый аукцион № 10-А-11 на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске

Вид аукциона: открытый (на повышение цены продажи).
Предмет аукциона: право заключения договора аренды земельного участка.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляется право аренды на 5 лет 6 земельных участков для строительства в г. Минске:

| № п/п | Место расположения земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь, га | Функциональное назначение предполагаемого объекта строительства | Начальная цена предмета аукциона (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона (бел. руб.) | Условия, предусмотренные в решении Мингорисполкома об изъятии земельного участка для проведения аукциона |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1. | микрорайон Лошица-3, по генплану № 15 | 500000000003003909 | 0,1802 | Кафе с магазином кулинария | 135 539 336 | 13 000 000 | 4 512 025 | – |
| 2. | ул. Карвата в районе КПП | 500000000001005326 | 0,1000 | Кафе | 74 588 724 | 7 000 000 | 4 341 284 | – |
| 3. | ул. Кижеватова (ПДП поз.17.1) | 500000000004004465 | 0,2000 | Объект общественного питания | 149 177 448 | 14 000 000 | 4 356 428 | – |
| 4. | ул. Соединительная магистраль | 500000000002007528 | 0,1500 | Станция технического обслуживания с помещениями сопутствующего назначения | 30 763 719 | 3 000 000 | 5 895 747 | – |
| 5. | ул. Матусевича | 500000000006006046 | 0,4000 | Размещение детских аттракционов на земельном участке в парке 60-летия Октября | 336 353 472 | 33 000 000 | 4 786 333 | – |
| 6. | Микрорайон Масюковщина-5 | 500000000006006100 | 0,3000 | Магазин промышленных и продовольственных товаров 200 кв.м торговой площади с объектами общественного питания и бытового обслуживания по генплану № 22 | 230 413 977 | 23 000 000 | 7 137 346 | – |

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится **27 июля 2011г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**внести задаток (не позднее 21 июля 2011 г.)** в размере, указанном в графе 7 (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков задаток вносится для каждого из предметов аукциона), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – Финансовое управление Мингорисполкома (задатки вносятся в белорусских рублях в суммах согласно настоящему извещению);

представить в УП «Минский городской центр недвижимости» – организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе;

заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка в установленном размере (без НДС);

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым участник аукциона, которому по результатам аукциона в установленном порядке предоставляется земельный участок, обязан возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения.

Дополнительно представляется:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6 с 13 июля 2011 г. по 21 июля 2011 г. по рабочим дням в рабочее время.**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победители торгов (участники аукциона, которым земельные участки предоставляются как единственным, подавшим заявление на участие в аукционе) в течение 10 рабочих дней со дня принятия Минским горисполкомом решений о предоставлении им соответствующих земельных участков обязаны:

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона;

- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.**

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком заключает с победителем аукциона (в установленных законодательством случаях – с его участником) договор аренды земельного участка сроком на 5 лет.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона Минский горисполком может предоставить победителю аукциона рассрочку по внесению платы за предмет аукциона в установленном порядке.

После истечения срока аренды земельного участка (5 лет), предоставленного по результатам аукциона, лицо, которому он предоставлен, в установленном порядке обращается в адрес Минского горисполкома с заявлением о продлении срока аренды соответствующего участка (заключении нового договора аренды), на основании которого по решению исполкома ему предоставляется земельный участок на указанный в заявлении срок, но не более чем на 99 лет, при условии внесения этим лицом платы за право аренды земельного участка, рассчитанной на основании его кадастровой стоимости с применением коэффициентов, установленных Советом Министров Республики Беларусь исходя из сроков аренды земельных участков.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по соответствующим земельным участкам (в том числе с характеристиками расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории).

Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактный телефон: + 375 (17) 226 16 72, официальный сайт организатора аукциона: www.mgcn.by.**

